Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
Родная газета на роднай мове
# ЗВЯЗДА
20 ЛЮТАГА 2021 г. СУБОТА № 33 (29402)

## ПРЭЗІДЭНТ НАКІРАВАЎСЯ З ВІЗІТАМ У РАСІЮ

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка накіраваўся з рабочым візітам у Расійскую Федэрацыю, паведамляе прэс-служба беларускага лідара.**

У Сочы 22 лютага адбудуцца перагаворы кіраўніка беларускай дзяржавы з Прэзідэнтам Расіі Уладзімірам Пуціным. Плануецца, што лідары дзвюх краін падрабязна абмяркуюць шырокі комплекс пытанняў развіцця беларуска-расійскіх адносін, сумеснае рэагаванне на выклікі, у тым ліку ў сферы ваеннай бяспекі, узаемадзеянне ў інтэграцыйных структурах.

Акрамя таго, Аляксандр Лукашэнка і Уладзімір Пуцін абмяняюцца думкамі па тэматыцы міжнароднага парадку дня.

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Дзмітрый МАТУСЕВІЧ, старшыня Дзяржаўнага камітэта па маёмасці:**

*«Летась на падставе землеўпарадкавальных матэрыялаў мясцовымі і распарадчымі органамі на аўкцыёнах рэалізаваны 1 731 зямельны ўчастак на суму 57,7 мільёна рублёў. Акрамя таго, сфарміраваны 83 зямельныя ўчасткі для размяшчэння аб'ектаў дзяржаўнай нерухомай маёмасці, якія падлягаюць продажу».*

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «Ён не можа быць страчаны, бо гэта здабытак нашага народа»

### Аляксандр Лукашэнка наведаў Купалаўскі тэатр

**Кожны новы сезон Купалаўскі тэатр адкрывае «Паўлінкай» Янкі Купалы. Гэтая пастаноўка з'яўляецца візітнай карткай беларускай драматургіі. Але напярэдадні свайго стагадовага юбілею калектыў тэатра аказаўся ўцягнуты ў палітычныя падзеі поствыбарнага перыяду. Частка трупы звольнілася, спектаклі прыпыніліся... І ўсё ж «Паўлінка» ў Купалаўскім будзе. Гэта стала зразумела, калі тэатр зладзіў кастынг акцёраў для аднаўленай пастаноўкі, распачаліся рэпетыцыі. Учора на рэпетыцыю легендарнага спектакля завітаў кіраўнік дзяржавы. Не абышлося і без шчырай гутаркі з купалаўцамі.**

Міністр культуры Анатоль Маркевіч коратка расказаў Прэзідэнту аб стане спраў ва ўстанове і адраджэнні «Паўлінкі». Ён распавёў, што ў абноўленым спектаклі задзейнічаны акцёры Купалаўскага з ранейшай трупы і студэнты БДУКМ і БДАМ, якія, па словах Анатоля Маркевіча, добра ўліліся ў калектыў. Прэзідэнту паказалі 30-хвілінны фрагмент з 2-га акта «Паўлінкі», спектакль зараз актыўна рэпеціруюць, рыхтуючыся да прэм'еры.

СТАР. 2



Фота БелТА

# Па «замкавай» лыжні



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Жыхары і госці Нясвіжа гэтай снежнай зімой маюць магчымасць сумясціць лыжны шпацыр з экскурсіяй па маляўнічых наваколлях старажытнага замка.

## КОРАТКА

- **Прэм'ер-міністр Беларусі Раман Галоўчанка наведаў друкарню ў Бабруйску.**
- «Белавія» пачала ажыццяўляць рэгулярныя рэйсы ў Дубай.
- **Мінсувязі і «Белтэлекам» прэзентавалі мабільную праграму «Мой горад».**
- У Беларусі ў студзені пабудавалі 4,7 тысячы новых кватэр.
- **Новы корпус Брэсцкай дзіцячай абласной бальніцы плануюць увесці ў строй восенню.**
- Мемарыяльную дошку ў гонар унікальнай аперацыі, праведзенай у гады Вялікай Айчыннай вайны, адкрылі на будынку чыгуначнай станцыі Чырвоны Бераг у Жлобінскім раёне.



- **У Беларусі на 1 лютага зарэгістравана на 19 % менш беспрацоўных, чым год таму.**
- Фінал праекта «100 ідэй для Беларусі» адбудзецца 24 лютага.

ISSN 1990 — 763X

З нагоды

# «РОДНАЕ СЛОВА» ЯК НАТХНЕННЕ

**21 лютага ўвесь свет адзначае Дзень роднай мовы. Далучаюцца да яго і беларусы, чый шлях да асэнсавання каштоўнасці свайго моўнага скарбу быў асабліва пакручасты. З нагоды свята наведаемся ў госці да выдання, якое прысвечана мове. Гаворка пра штомесячны навукова-метадычны часопіс «Роднае слова», які заснаваны ў 1987 годзе і ўваходзіць сёння ў склад РУП «Выдавецтва «Адукацыя і выхаванне»». Не адно пакаленне настаўнікаў, студэнтаў, школьнікаў знаходзіла на яго старонках карысныя парады і натхненне. Менавіта туды дасылалі малады філолагі, якія пасля сталі вядомымі навукоўцамі, свае першыя работы — часопіс уключаны ў Пералік навуковых выданняў ВАК Рэспублікі Беларусь для друкавання вынікаў дысертацыйных даследаванняў.**

СТАР. 8



# «Ён не можа быць страчаны, бо гэта здабытак нашага народа»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Мастацкі кіраўнік пастаноўкі — актрыса тэатра Вольга Няфёдава, галоўны рэжысёр — студэнтка Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў Зінаіда Вядзеніна. Ролю Паўлінкі выконвае студэнтка ўніверсітэта культуры Анастасія Варанкова.

Пасля прагляду фрагмента Прэзідэнт падняўся на сцэну, дзе і пагутарыў з акцёрамі. Закранулі ў размове і прыемныя нагоды — Аляксандр Лукашэнка павіншаваў з нядаўнім днём нараджэння Вольгу Няфёдаву і слаўтага Генадзя Аўсяннікава, які святкаваў асабістую дату якраз учора. Але больш гаварылі пра набалелае.

### «Выказвайце сваю пазіцыю, пункт гледжання, але не парушайце законы»

«Я не шкадую аб тым, што адбылося ў гэтым тэатры. З аднаго боку — людзей убачылі, з другога — не было б шчасця, ды няшчасце дапамагло, паглядзіце, колькі моладзі прыйшло. То-бок імгненна абнавілася сапраўдная «кроў» гэтага тэатра. Добра, што ў нас ёсць дарослыя людзі, якія дапамогуць моладзі», — сказаў Прэзідэнт.

«Усякае ў жыцці бывае. Хтосьці з нечым не згодны, і ёсць месца і час выказваць сваю боязь і нязгоду. Ніхто супраць гэтага не будзе. Я ўвогуле прыхільнік розных пунктаў гледжання. Выказвайце сваю пазіцыю, пункт гледжання, але не парушайце законы», — падкрэсліў Прэзідэнт і заклікаў калектыў тэатра да адкрытай размовы.

Прэзідэнт падкрэсліў, што тэатр не можа быць страчаны: «***З вамі ці без вас, але мы б абавязкова аднавілі работу гэтага тэатра. Ён не можа быць страчаны, бо гэта набытак нашага народа***».

### Не мастацтвам адзіным

Прэзідэнт расказаў пра планы на фінансаванне Купалаўскага тэатра. «Усе сродкі, якія вы атрымаеце, — гэта будуць вашы сродкі, ваш прыбытак. Я вам скажу, як будзе не з гэтага года, а з 2022 года: што вы напрацуеце па-за бюджэтам — столькі мы вам з бюджэту дадзім», — сказаў Прэзідэнт.

Ён дадаў, што калісьці такая норма была прапанавана для спартыўных клубаў і федэрацый. «***Зарабілі два мільёны долараў, два мільёны і мы вам дададзім з бюджэту. Пяць зарабілі, пяць дадзім — і працуйце***. Але я паглядзеў на вас: за мінулы год на тое і спрацавалі. Вы 45 % па-за бюджэтам зарабілі, а астатняе — бюджэтныя сродкі. Мы павінны выйсці на гэтую раўнавагу. І ў вас будзе жаданне зарабляць. Вашы грошы будуць у вас», — дадаў кіраўнік краіны.

На яго думку, неабходна адысці ад устанаўлення ставак для супрацоўнікаў тэатра. Ён прапанаваў зрабіць у дзяржаўных тэатральных калектывах саветы на ўзор прыватных арганізацый, у якія ўвойдзе ад трох да пяці чалавек. Яны будуць мець права разам з дырэктарам размяркоўваць грашовыя сродкі. «Яны няхай абяруць гэты савет. І няхай яны самі дзеляць гэтыя грошы, якія мы ім дадзім. Гэта павінна быць усюды, ва ўсіх 29 калектывах (столькі дзяржаўных тэатраў у краіне. — **«Зв.»**). Прадумайце гэтую ідэю. Гэта не спантанна мною выказана», — сказаў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка лічыць, што такі падыход дапаможа вывесці тэатр на большую самастойнасць і рыначныя адносіны.

### Пра добры нацыяналізм

«***Нацыяналізм — гэта не балбатня на «мове», а імкненне зрабіць нешта, што застанецца ў народнай памяці***», — падзяліўся сваім меркаваннем Прэзідэнт.

Ён дадаў, што сам заўсёды імкнуўся рабіць так, каб у народа былі традыцыі. Палітычныя традыцыі, па яго словах, — штогадовае выступленне Прэзідэнта з Пасланнем парламенту і беларускаму народу і кожныя пяць гадоў — Усебеларускі народны сход.

«Вы таксама сталі нават не традыцыяй, а сімвалам нашага народа. Таму ***заўсёды трэба ствараць тое, што будзе цябе адрозніваць ад іншых***. І ў гэтым будзе добры нацыяналізм, за што мяне ў Расіі часам крытыкуюць і папракаюць. Але я кажу: я ж Прэзідэнт Беларусі. Пры ўсёй любові да расіян, я — Прэзідэнт Беларусі. Таму я буду рабіць усё, што трэба нашым беларусам, тое, што нас будзе адрозніваць. Ад рускіх таксама», — акцэнтаваў кіраўнік дзяржавы.

На думку Прэзідэнта, руская мова нараўне з беларускай — багацце нашага народа. «Нам ад гэтай спадчыны (рускай мовы. — **«Зв.»**) адмаўляцца нельга. Вы ўсе разумееце, асабліва рэктары нашых ВНУ, што мова — гэта жывое, тое, што пастаянна развіваецца», — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка.

Ён падкрэсліў, што ні творчыя работнікі, ні палітыкі не маюць права на паспешлівасць у сваёй дзейнасці і ўчынках. «***Мы павінны акуратна весці палітыку на гэтым кавалку зямлі. Гэта наша, мы больш не просім, і ні ў кога не павінны прасіць. Гэта наша, але мы міліметра нікому не аддадзім***», — заявіў кіраўнік краіны.

### Творчы абавязак

Прэзідэнт расказаў, што некалькі гадоў таму ў прыватнай размове амерыканскія і еўрапейскія палітыкі яму казалі, што Беларусь — самая гатовая да ўступлення ў Еўрапейскі саюз краіна. «Без праблем, без канфліктаў, здольная жыць нармальна. Так, кажуць, вы ствараеце там прадукцыю, якую і мы ствараем, асабліва немцы. Германія — машынабудаўнічая краіна, і мы таксама. Але гэта не праблема, казалі: «У вас свае рынкі. Але вы лепш, чым некаторыя краіны, якія мы прымаем». На Усходнюю Еўропу намякалі», — сказаў Прэзідэнт.

Ён заявіў, што нельга адмаўляцца ад таго, што ёсць у нас, і глядзець на іншыя краіны. І задаў рытарычнае пытанне: калі б у Літве так было добра, з 4,5 мільёна насельніцтва ці засталося б там 1,5-2 мільёны жыхароў?

«Зараз гатовыя, каб мы да іх прыехалі. І што мы там будзем рабіць? Так, падлогу будзем мыць. Магчыма, адзін, два, тры вельмі здольныя будуць нядрэнна жыць. Але лідарамі, як тут, ніколі не будуць. Ім не дазволяць гэтага. У іх сваіх хапае, яны па-сапраўднаму нацыяналісты. Я таксама не хачу, каб тут хтосьці прыехаў з Амерыкі ці Польшчы і верхаводзіў», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік краіны, звярнуўшыся да прысутных на сустрэчы, папрасіў іх захоўваць сваю Радзіму. «***Давайце будзем берагчы нашу краіну, а вы ў сваёй творчасці павінны гэта ўсё ўвасобіць. Абавязаныя! Не мне. Вы сваёму народу абавязаныя. Няхай мінулы год будзе вялікім урокам для нас. Асабліва для нашых дзяцей***. Мы можам іх проста страціць», — падкрэсліў Прэзідэнт.

### Вакцына для артыстаў

Размаўляючы з калектывам тэатра, Прэзідэнт закрануў і тэму вакцынацыі ад каранавіруса, расказаўшы пра варыянты замежных прэпаратаў, якімі робяць прышчэпку ў Беларусі.

Кіраўнік краіны прапанаваў усім купалаўцам, хто жадае, зрабіць укол вакцыны. «Усіх урачоў мы ўжо правакцынавалі практычна, хто не хварэў і хто жадаў. Зараз пачалі педработнікаў, прадаўцоў вакцынаваць. То бок тых, хто больш кантактуе з людзьмі, каб перадусім іх больш абараніць. І дзесьці на працягу месяца мы атрымаем сваю вакцыну — пачнём ствараць па расійскіх тэхналогіях», — паведаміў Прэзідэнт.

Ён выказаў спадзяванне, што да канца года айчынныя навукоўцы зробяць і ўласную вакцыну. «Я іх не падганяю, бо вірус пачаў муціраваць, з'явіліся новыя штамы. Мы якраз выйдзем на тыя, што будуць у канцы года. То-бок зможам у гэтым плане выйграць. Нешта прыдумаем. Вучоныя ў нас малайцы», — падкрэсліў кіраўнік краіны.

### «Галоўнае, каб у тэатр ішлі людзі»

Актрыса Вольга Няфёдава падзякавала Прэзідэнту за ўвагу да галоўнага тэатра краіны: «Я прыйшла ў тэатр у 1992 годзе пасля інстытута, заспела яшчэ стары будынак, напалову разбураны, я ведаю, што канкрэтна вы зрабілі. Вы зрабілі з тэатра тэатр, нацыянальны, акадэмічны, а гэта душа, — сказала яна. — І канкрэтна вы накіравалі, вы далі, і падняліся мы з руін. У нас былі такія грымёркі, што мама не гаруй! Страх быў гасподні. А цяпер і прыбіральні, і душы, усё створана для таго, каб мы тварылі сапраўды, бо Купалаўскі — гэта душа нацыі. Вы ж маглі не заўважыць, маглі адцягнуць увагу на іншыя дзяржаўныя справы, таму менавіта па вашай ініцыятыве, па вашай волі, і мы гэта ведаем і вельмі цэнім. І я не стамлюся вам дзякаваць за гэта, за тое, што мы сапраўды ў годных, выдатных умовах. У нас такая тэхніка, якой няма ў іншых тэатрах, нават маскоўскіх».

Актрыса расказала пра тое, як адбывалася аднаўленне «Паўлінкі» і пра далейшыя планы тэатра. «Зараз рэпетуецца «Вечар» для аднаўлення, таксама ўводзім новага чалавека на ролю Васіля. Потым у нас у планах «Зямля Эльзы». Гэта ўсё тое, што належыць Купалаўскаму тэатру і тое, што наша, тое, што было, мы гэта адраджаем. Акрамя таго, у нас ёсць у праектах некалькі пастановак, якія мы мастацкім саветам будзем абмяркоўваць: вельмі добрая трагікамедыя пра тое, што жыццё працягваецца. Не тое, што трагедыя і ўсе плачуць, але жыццё працягваецца. Мы жывём далей», — паведаміла яна.

Актрыса закранула тэму фінансавання, без якога, на яе думку, тэатру на дадзеным этапе не абысціся. Яна выказала спадзяванне, што дзяржаўная падтрымка Купалаўскаму будзе аказана. За трупай стаіць яшчэ і калектыў тэатра — больш за сто чалавек. «Усе стойкія, усе трымаюцца, усе не прадаюць, не здаюць, бо ёсць перакананні, ёсць душа, ёсць самае галоўнае — Радзіма», — сказала Вольга Няфёдава.

Аляксандр Лукашэнка адказаў, што ў сёлетні дзяржаўны бюджэт па яго даручэнні былі закладзены сродкі на Купалаўскі тэатр. Галоўнае, падкрэсліў ён, каб у тэатр ішлі людзі.

«Гэты тэатр больш за 100 гадоў існуе, і народ яго проста абагаўляе. І нават калі з намі здарылася гэтая бяда, усё роўна акцёры іншых тэатраў — яны ўсё глядзяць: як мы, што мы, ствараем што. Ён заўсёды быў вызначальным, на яго заўсёды глядзелі і цяпер глядзяць, думаюць: калі ж?» — адзначыла на сустрэчы з кіраўніком дзяржавы артыстка тэатра Тамара Міронава.

У гутарцы з Прэзідэнтам закраналіся таксама пытанні падбору кадраў для тэатра, пошуку рэжысёраў і мастацкага кіраўніка, магчымасці дзяржаўнай падтрымкі як тэатра ў цэлым, так і творчых работнікаў.

Аляксандр Лукашэнка даручыў кіраўніцтву горада разгледзець магчымасць пабудаваць для творчых работнікаў маласямейныя інтэрнаты накшталт тых, што ёсць для медработнікаў у Бараўлянах.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА,**
**Марыя ДАДАЛКА.**

Парламенцкі дзённік

# Стварыць умовы, каб хабар стаў немагчымы

## Карупцыя спрадвеку была і, напэўна, будзе, але гэта не значыць, што з ёй можна мірыцца

**Гэтая думка неаднаразова гучала падчас парламенцкіх слуханнях ААН на тэму «Барацьба з карупцыяй для аднаўлення даверу да ўрада і паляпшэння перспектыў развіцця», у якой узялі ўдзел і беларускія парламентарыі. Слуханні адбыліся ў фармаце відэаканферэнцыі 17—18 лютага. Па іх выніках будзе падрыхтаваны тэматычны даклад да спецыяльнай сесіі Генеральнай Асамблеі ААН па барацьбе з карупцыяй, якая адбудзецца сёлета ў чэрвені.**

«Для нас вельмі важна абмеркаваць, абмяняцца думкамі пра тое, якое месца займае заканадаўчая ўлада ў барацьбе з карупцыяй, — заявіў у сваім выступленні **дэпутат Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі па нацыянальнай бяспецы Іван МАМАЙКА.** — Тым больш што ў вясновую сесію мы маем намер разгледзець у першым чытанні новую рэдакцыю Закона «Аб барацьбе з карупцыяй».

Злоўжыванні ўладай для атрымання выгады ў асабістых мэтах суправаджае чалавецтва са старажытных часоў, дадаў беларускі дэпутат. У XXI стагоддзі, нягледзячы на часам досыць жорсткія метады барацьбы з гэтым злом, карупцыйныя правапарушэнні прыносяць каласальную матэрыяльную шкоду. Па афіцыйных звестках ААН, штогадовы аб'ём хабару ў свеце складае 1 трыльён долараў, а па ацэнцы Еўрапейскага бюро па барацьбе з махлярствам, краіны Еўрасаюза штогод з-за карупцыі страчваюць 323 мільярды еўра, прывёў лічбы наш парламентарый.

«Прэзідэнт нашай краіны заўсёды падкрэслівае, што гэтая з'ява можа пагражаць існаванню дзяржавы. Трэба сказаць, што нашы намаганні ў барацьбе з карупцыяй даюць плён, пра што сведчаць адпаведныя сусветныя рэйтынгі, — заўважыў Іван Мамайка. — У беларусаў склалася адмоўнае стаўленне да карупцыі, на шчасце, мы не ўспрымаем гэтую з'яву як нешта звычайнае і штодзённае. Добры прыклад яскравага адрознення ад суседніх краін тут — наша ДАІ».

Парламентарый назваў удалым дзеючы беларускі Закон «Аб барацьбе з карупцыяй» і новую рэдакцыю закона «Аб аператыўна-вышуковай дзейнасці», тым не менш любая сфера жыцця грамадства, дзе закранаюцца матэрыяльныя інтарэсы людзей, не застрахаваная ад злоўжыванняў з боку адказных асоб, лічыць ён.

«Задача дзяржавы — ствараць умовы, пры якіх хабар становіцца максімальна немагчымы», — сказаў Іван Мамайка.

**Старшыня 75-й сесіі Генеральнай Асамблеі ААН Валкан БАЗКЫР (Турцыя)** акрэсліў новую тэндэнцыю: «Каб змагацца з пандэміяй COVID-19, многія ўрады аб'явілі пра трыльённыя выдаткі, што таксама стварае падставу для карупцыйных схем. Узнікае пытанне з празрыстасцю работы фондаў, якія акумулююць сродкі для барацьбы з распаўсюджваннем інфекцыі. Парламенты павінны кантраляваць расходаванне гэтых грошай. Асабліва важна не дапусціць карупцыі ў пытанні закупкі вакцын ад COVID-19».

Старшыня Генасамблеі падкрэсліў, што наступствам карупцыі ў сферы закупак на ўмовах пандэміі сталі тысячы смерцяў.

«Карупцыя для дэмакратыі ўсё роўна што рак, — дадаў **старшыня Міжпарламенцкага саюза Дуартэ ПАШЭКУ (Партугалія).** — Пачынаецца з лёгкіх сімптомаў, але потым усе складнікі арганізма, які называецца «дэмакратыя», перастаюць працаваць. Але мы ведаем, што з карупцыяй, гэтак жа як і з хваробай, можна змагацца, і ведаем, як. Для гэтага патрэбны палітычная воля, адпаведнае заканадаўства і рэсурсы, каб яно працавала».

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

Занятасць

# РАБОТА НА ЛЮБЫ ГУСТ

## На Віцебшчыне на кожнага непрацуючага больш за пяць вакансій

**Нядаўна на сесіі Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў зацвердзілі рэгіянальны комплекс мерапрыемстваў па рэалізацыі Дзяржаўнай праграмы «Рынак працы і садзейнічанне занятасці» на 2021—2025 гады. На гэтыя мэты запланавана накіраваць каля 27,7 мільёна рублёў. Фінансаванне амаль цалкам будзе ажыццяўляцца з дзяржаўнага пазабюджэтнага фонду сацыяльнай абароны насельніцтва Рэспублікі Беларусь.**

Статыстыка сведчыць: за пяцігодку ў раёне не дапушчана росту ўзроўню беспрацоўя: у пачатку 2016 года гэты паказчык быў 1,1 %, у канцы 2020-га — 0,3 %. На сёння на кожнага беспрацоўнага прыходзіцца больш чым пяць вакансій! На новыя рабочыя месцы за кошт стварэння новых вытворчасцяў і прадпрыемстваў за пяцігодку ўладкавана больш за трыццаць з паловай тысяч чалавек.

Некалькі фірмаў Віцебшчыны, каб прыцягнуць да сябе моладзь, запрашаюць на практыку, дапамагаюць атрымаць неабходную для вытворчасці спецыяльнасць, плацяць стыпендыі, вырашаюць бытавыя праблемы. Толькі прыходзь і працуй! У прыватнасці, такі падыход на віцебскай фірме па вырабе ўнікальных пад'ёмнікаў.

А на Мёрскім металапракатным заводзе будуюць цэлы гарадок з багатай сацыяльна-бытавой і забаўляльнай інфраструктурай для якасці пражывання на еўрапейскім узроўні.

Трактарысту мясакамбіната прапануюць 1200 рублёў і больш...

Нечакана «зачапіла» прапанова ад цэнтра культуры і народнай творчасці Пастаўскага раёна: маюць патрэбу ў майстры народных промыслаў (аплата ад 450 рублёў у месяц). Навальшчык-звальшчык лесу ў Расонах можа зарабляць ад 500 рублёў, экскаваташчык у Оршы (на прадпрыемстве ЖКГ) — ад 800, шэфу-кухару Браслаўскага дома-інтэрната прапануюць мінімум 650 рублёў, у Сянно падсобнаму рабочаму УП ЖКГ — ад 400 рублёў...

«Мала!» — скажуць вечна незадаволеныя песімісты. Але ёсць і іншыя прапановы. Калі набраў у пошуку суму заробку 2000 рублёў, адразу «выскачыла» аж 13 вакансій. Што дзіўна, не толькі ахвотным стаць кіраўнікамі прапаноўваецца такая зарплата.

Напрыклад, інжынеру па прамысловым і грамадзянскім будаўніцтве гатовыя плаціць у Полацку ажно... дыхайце глыбей — ад 3240 рублёў.

А гаспадарка ў Докшыцкім раёне за дастойныя грошы чакае адразу некалькіх работнікаў. У прыватнасці, аператару па штучным асемяненні жывёл і птушкі заплацяць каля 2000 рублёў, аграному — 2500, а яго патэнцыйнаму начальніку — ад 3000...

Галоўны спецыяліст па жывёлагадоўлі ў прыгарадзе Віцебска будзе зарабляць ад 2000.

Работы хопіць на кожнага, толькі працуй! І ўжо ад тваіх навыкаў і інтэлекту залежыць, колькі ты зможаш зарабляць.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

Добрая навіна

# КАМП'ЮТАРНЫ ТАМОГРАФ АДКРЫЛІ Ў БЯРОЗЕ

**У Бярозаўскай цэнтральнай раённай бальніцы адкрылі кабінет камп'ютарнай тамаграфіі. А раней пацыентаў з райцэнтра вазілі на абследаванне ў Баранавічы, Брэст, суседні Драгічын.**

Названы тамограф — адзін з 25 апаратаў, закупленых для ўстаноў краіны Міністэрствам аховы здароўя за кошт пазыкі Міжнароднага банка рэканструкцыі і развіцця з мэтай барацьбы з ковідам. Апарат камп'ютарнай тамаграфіі дазваляе праводзіць абследаванне ўсяго арганізма чалавека: на ім можна разгледзець галаўны мозг, органы грудной клеткі і брушной поласці, косткі канечнасцяў і суставы. Вядома, і ковідныя пнеўманіі цяпер магчыма будзе дыягнаставаць больш дакладна.



Фота з сайта газеты «Заря».

Загадчыца аддзялення Бярозаўскай райбальніцы Святлана ПАЛЯКОВА адзначыла, што КТ дазволіць выяўляць анкалагічныя хваробы, захворванні сардэчна-сасудзістай сістэмы на больш ранніх стадыях.

Старшыня Брэсцкага аблвыканкама Юрый ШУЛЕЙКА, які браў удзел у адкрыцці новага кабінета, адзначыў, што сёлета запланавана ўвод у строй шэрагу аб'ектаў аховы здароўя. Абсталяванне для паліклінік і бальніц будзе набывацца рэгулярна. На чарзе — новыя тамографы для Баранавіцкага анкадыспансера, Лунінецкай райбальніцы і Пінскай цэнтральнай бальніцы.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## У Ватыкане адмова ад вакцынацыі можа пагражаць звальненнем



Улады Ватыкана прынялі дэкрэт, згодна з якім адмова ад вакцынацыі супраць каранавіруса COVID-19 без медыцынскіх паказанняў можа пацягнуць «разрыў працоўных адносін», паведаміла агенцтва Associated Press. У горадзе-дзяржаве ўдакладнілі, што адсылка да магчымых наступстваў адмовы ад прышчэпкі «ні ў якім разе не мае карнага характару», адзначыла агенцтва Catholic News Agency. Яно прыводзіць заяву губернатара Ватыкана Джузепе Бертэла, у якім адзначаецца, што добраахвотны ўдзел у праграме вакцынацыі павінны, тым не менш, улічваць, што адмова чалавека ад прышчэпкі можа падвергнуць небяспецы яго і іншых людзей. У канцылярыі Бертэла растлумачылі, што ўлады гатовы шукаць «альтэрнатыўныя варыянты» працаўладкавання для тых, хто не хоча вакцынавацца. У Ватыкане працуе каля пяці тысяч чалавек. Вакцынацыя прэпаратам Pfizer у краіне стартавала ў пачатку студзеня. Папа Рымскі Францыск ужо зрабіў неабходныя для выпрацоўкі ўстойлівага імунітэту дзве прышчэпкі.

## Карыстальнікі Facebook у Аўстраліі засталіся без навін



Сацыяльная сетка заблакіравала доступ да навін для сваіх карыстальнікаў у Аўстраліі. Гэта азначае, што на тэрыторыі краіны будзе нельга праглядаць паведамленні сродкаў масавай інфармацыі. Акрамя таго, карыстальнікі «Фэйсбука» за межамі Аўстраліі страцілі доступ да матэрыялаў аўстралійскіх СМІ. Рашэнне сацсеткі выклікана жаданнем уладаў Аўстраліі прымусіць інтэрнэт-гігантаў, такіх як кампаніі Facebook і Google, плаціць за навінавыя матэрыялы, даступныя на гэтых платформах. Таксама былі заблакіраваны старонкі некалькіх дзяржаўных агенцтваў, у тым ліку медыцынскіх і тых, якія адказваюць за ліквідацыю надзвычайных сітуацый. Пазней кампанія растлумачыла, што гэта было зроблена памылкова. Урад Аўстраліі рэзка раскрытыкаваў дзеянні Facebook, заявіўшы, што яны дэманструюць «велізарную рынкавую моц гэтых сацыяльна-лічбавых гігантаў». Кіраўнік аўстралійскага казначэйства Джош Фрыдэнберг заявіў, што забарона на навіны будзе мець «велізарныя наступствы для мясцовых суполак». Штомесяц «Фэйсбукам» карыстаецца каля 17 млн аўстралійцаў, у буйных аўстралійскіх СМІ, такіх як тэлекампанія ABC і газеты Sydney Morning Herald і The Australian, мільёны фаловераў.

## Робат Perseverance прыбыў на Марс шукаць сляды іншапланетнага жыцця



Амерыканскае касмічнае агенцтва NASA пасадзіла на Марс новы ровер «Perseverance (з англійскай — «непахіснасць, упартасць»). Галоўнай задачай марсахода стане пошук на Чырвонай планеце слядоў бактэрыяльнага жыцця. Навукоўцы ўпэўнены, што калі на Марсе калісьці было жыццё, то яно прыпадае на перыяд ад 3 да 4 млрд гадоў таму, калі на планеце яшчэ была вада. Perseverance стаў трэцім касмічным апаратам, які прыбыў да Марса за апошні месяц: раней на яго арбіту выйшлі робаты ААЭ і Кітая. Усе тры місіі пакінулі Зямлю ў ліпені 2020 года. «Гэта ўражвае», — сказаў выканаўчы абавязкі кіраўніка NASA Стыў Юрчык. Паводле яго слоў, адпраўка апарата адбывалася ў асабліва цяжкіх умовах з-за пандэміі і звязаных з ёй мер засцярогі, і гэта толькі павялічвае радасць ад поспеху. Прызямленне на Марс было вельмі няпростай задачай. У адрозненне ад Месяца, ён валодае атмасферай, што моцна ўскладняе прызямленне: толькі каля 40 % падобных місій заканчваецца поспехам.

Сацыяльны вектар

# ПАД АБАРОНАЙ ДЗЯРЖАВЫ

## і з дапамогай валанцёраў

**З пачатку года тэрытарыяльнымі цэнтрамі сацыяльнай абароны насельніцтва выканана 4,4 тысячы заявак па дастаўцы прадуктаў харчавання, прадметаў першай неабходнасці і лекаў, аб чым паведамляецца на сайце Міністэрства працы і сацыяльнай абароны.**

Усяго за час правядзення кампаніі па падтрымцы пажылых грамадзян і інвалідаў у перыяд складанай эпідэмічнай абстаноўкі, пачынаючы з 20 сакавіка 2020 г., тэрытарыяльнымі цэнтрамі выканана амаль 45 тысяч заявак. Заяўкі на дастаўку прадуктаў, прадметаў першай неабходнасці і медыкаментаў прымаюцца штодня ад 8 да 17 гадзін (па рабочых днях).

Для арганізацыі аператыўнай дастаўкі на дапамогу сацыяльным работнікам прыйшлі валанцёры БРСМ і Чырвонага Крыжа. Сацыяльныя паслугі аказваюць 146 тэрытарыяльных цэнтраў сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва, у якіх працуе 20 тысяч чалавек, з іх 11,5 тысячы — сацыяльныя работнікі.

На сістэмнай аснове комплексныя сацыяльныя паслугі дома атрымліваюць 97 тысяч непрацаздольных грамадзян. У асноўным гэта людзі, старэйшыя за 75 гадоў. Сацыяльныя работнікі наведваюць пажылых грамадзян два-чатыры разы на тыдзень у залежнасці ад патрэбы.

Сацыяльныя паслугі ўключаюць прыборку памяшканняў, гатоўку ежы, дапамогу ў санітарна-гігіенічных працэдурах, дастаўку прадуктаў харчавання, прадметаў першай неабходнасці і лекаў, аплату камунальных паслуг і іншае. Дадаткова ў сельскай мясцовасці — распальванне печы, дастаўку вады, уборку прыдамовай тэрыторыі.

Пры аказанні сацыяльных паслуг і дастаўцы прадуктаў сацыяльныя работнікі і валанцёры прымаюць неабходныя супрацьэпідэмічныя меры, выкарыстоўваюць сродкі індывідуальнай аховы.

**Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.**

Транспарт

# Уласны самазвал з дыстанцыйным кіраваннем

**У Мінску паказалі першы кампактны самазвал «Мацак» («Крепыш») з гідраўлічным кранам-маніпулятарам. Такія аўтамабілі пачаў збіраць беларускі вытворца «Аксіём-груп» на сваіх вытворчых плошчах у сталіцы.**



Самазвал AGD08M мае амаль што беларускія карані: ён спраектаваны і сабраны ў Мінску. Праўда, у яго аснове — шасі японскага паходжання. Даўжыня — крыху больш за шэсць метраў, але ў гэтым і ёсць перавага. Машына атрымалася спрытная і манеўраная: лёгка ездзіць у складаных закутках і прабіраецца ў абмежаванай прасторы.

А вось самазвальнае абсталяванне ў грузавіку роднае — выраблена ў Беларусі. Здольна перавозіць да 3500 кілаграмаў грузу і выконваць разгрузку на тры бакі. Вышыня бартоў дасягае метра, што забяспечвае прыстойную кубатуру тавараў, што перавозяцца. Уласна кажучы, адсюль і назва «Мацак»: габарыты машыны невялікія, а вось сілы «волатаўскія».

Самазвал абсталяваны кранам-маніпулятарам, сабраным італьянскім вытворцам. Каб работа ішла хутчэй, паклапаціліся аб пульце дыстанцыйнага кіравання і гідраўлічнай лябёдцы. Акрамя таго, можна кіраваць металічнай «рукой» з грузам з бяспечнага месца.

У самазвала ёмістая «японская» кабіна, дзе могуць знаходзіцца адразу тры чалавекі. У базавую камплектацыю ўваходзяць кандыцыянер і электрычны пакет.

«Нічога падобнага ў Беларусі раней не збіралі. Калі вобразна, мы злучылі ў аўтамабілі японскую надзейнасць, італьянскую якасць і беларускую старанкасць. Было важна зрабіць машыну кампактнай, так як гэта спрашчае яе эксплуатацыю і зніжае выдаткі, але ў той жа час ёмістай і функцыянальнай, з хуткай загрузкай і разгрузкай. Мы чакаем на яе вялікі попыт сярод беларускіх прадпрыемстваў», — прагназуюць вытворцы.

Дарэчы, першыя пяць машын ужо перададзены буйному прадпрыемству ЖКГ. Неўзабаве рушаць следам і іншыя — на прадпрыемстве чакаюць нямала заказаў ужо сёлета.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Навука

# Акцэнт — на гістарычную памяць і кансалідацыю грамадства

**НАН Беларусі зацвердзіла план мерапрыемстваў па правядзенні Года народнага адзінства.**

У Нацыянальнай акадэміі навук зацверджаны план мерапрыемстваў па правядзенні Года народнага адзінства. Гэта, у першую чаргу, мерапрыемствы, скіраваныя на кансалідацыю грамадства, згуртаванне беларускага народа на аснове ідэй суверэнітэту і незалежнасці краіны, мерапрыемствы па пашырэнні канструктыўнага дыялогу ў грамадстве і ўключэнню ў яго моладзі, а таксама шэраг мерапрыемстваў па ўмацаванні міжканфесійнага міру і міжнацыянальнай згоды, удасканаленні работы з беларусамі замежжа. У план увайшлі таксама знакавыя мерапрыемствы Савета маладых навукоўцаў НАН Беларусі. Усяго ў спіс уключана каля 30 пунктаў. Але, як адзначыў старшыня Прэзідыума НАН Беларусі Уладзімір Гусакоў, згаданы план — гэта толькі аснова. На працягу года ён будзе напаўняцца новымі знакавымі мерапрыемствамі і ініцыятывамі.

У Год народнага адзінства навукоўцы запланавалі правядзенне навуковых форумаў і канферэнцый, падрыхтоўку навуковых і навукова-папулярных публікацый, прысвечаных развіццю грамадзянскай супольнасці і інстытута мясцовага самакіравання, гісторыі беларускай дзяржаўнасці і подзвігу беларускага народа ў Вялікай Айчыннай вайне. Будуць праведзены лекторыі, дыскусійныя пляцоўкі, круглыя сталы «Грамадзянская супольнасць і дзяржава», рэгіянальныя канферэнцыі, прэзентацыі новых выданняў навукоўцаў Акадэміі навук.

Запланавана таксама правядзенне круглага стала «Сацыяльныя і эканамічныя прыярытэты і механізмы ўмацавання народнага адзінства» ў рамках Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Стратэгія развіцця эканомікі Беларусі: выклікі, інструменты рэалізацыі і перспектывы». Да Дня роднай мовы прымеркаваны круглы стол «Стварэнне беларускамоўнай закАнадаўчай базы як фактар гарманічнага развіцця грамадства».

На працягу года будуць праведзены сацыялагічныя даследаванні «Народнае адзінства як фактар умацавання беларускай дзяржавы» і прэзентацыя дзесяцітомнага збору твораў Янкі Брыля.

Пройдуць буйныя навуковыя форумы: Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Гістарычная памяць і патрыятызм як важнейшыя маральныя арыенціры беларускага грамадства і дзяржавы. Фактары кансалідацыі ва ўмовах сучасных выклікаў і пагроз», Міжнародная навуковая канферэнцыя «Рыжскі мір 1921 года ў лёсе беларускага народа (да 100-годдзя заключэння)», Міжнародная навуковая канферэнцыя «Германская агрэсія супраць СССР (да 80-годдзя трагедыі пачатку Вялікай Айчыннай вайны)» і іншыя. Адбудуцца таксама рэгіянальныя канферэнцыі: «Капыльскія чытанні — 2021», «IX Лепельскія чытанні», «Чачэршчына: вяртанне да вытокаў», XIV Карэліцкія краязнаўчыя чытанні «Гісторыка-культурная спадчына Карэліччыны».

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# «Мост дружбы» да чытача

## Пра што пішуць маладыя літаратары Саюзнай дзяржавы і як яны шукаюць шлях да публікі

**У межах XXVIII Мінскай міжнароднай кніжнай выстаўкі-кірмашу прайшоў круглы стол «Кніга і слова. Погляд у будучыню». Арганізатарамі мерапрыемства выступілі Пастаянны камітэт Саюзнай дзяржавы і Саюз пісьменнікаў Беларусі. Удзельнікі, сярод якіх пісьменнікі, літаратуразнаўцы дзвюх краін, абмеркавалі творчасць сучасных маладых аўтараў, а таксама падзяліліся ўласным бачаннем перспектыў для рэалізацыі творчага патэнцыялу тых, хто жадае рэалізаваць сябе ў літаратуры. Адна з такіх магчымасцяў — гэта літаратурны конкурс «Мост дружбы», які ладзіць Пастаянны камітэт Саюзнай дзяржавы.**



Фота БелТА.

**На выстаўцы нямала маладых наведвальнікаў. Літаратары-пачаткоўцы могуць разлічваць на чытачоў-равеснікаў.**

— «Мост дружбы» мы вядзём з 2012 года. І гэты праект дазволіў адкрыць каля 400 новых імён новых аўтараў, якія атрымалі магчымасць апублікавацца ў конкурсным альманаху. Летась на конкурс паступіла каля 80 аўтарскіх твораў, і 40 з іх у розных жанрах — апавяданні, навелы, нарысы, эсэ — пасля папярэдняга адбору былі прадстаўлены на разгляд экспертнага журы. І трэба сказаць, што моладзь па-рознаму ўяўляе будучыню. Па-першае, хоць я і не магу ацэньваць напісанае з пункту гледжання літаратурнай крытыкі, а толькі як чытач, але хачу адзначыць наступнае: калі мы гаворым «маладыя пісьменнікі», то часам нібы закладваем у гэта паблажлівую інтанацыю, а на самай справе перад намі ўжо сталыя творцы ў сваім творчым росквіце, — адзначыў **дзяржаўны сакратар Саюзнай дзяржавы Рыгор РАПОТА.** — Бо па стылістыцы і па тым, якія думкі там закладзены, гэта ўжо творы пісьменнікаў, якія адбыліся. Іх цікава чытаць, і над іх словамі хочацца думаць. Па-другое, калі гаварыць пра футуралогію і, можа, нават пра стварэнне фантастычнага асяроддзя для выказвання сваіх ідэй, то мяне цікавіць, напрыклад, не тое, як ляціць зоркалёт і хто ім кіруе, а людзі ў гэтай сітуацыі, іх паводзіны, пачуцці. І ўменне паказаць гэта, на мой погляд, вялікая заслуга літаратараў. Лічу, што нашы ўдзельнікі праекта «Мост дружбы» добра спраўляюцца з такой задачай.

Творчае спаборніцтва «Мост дружбы» дае магчымасць маладым талентам Расіі і Беларусі апублікавацца і заявіць пра сябе і сваё майстэрства валодання мастацкім словам. Як заўважыла член экспертнага савета конкурсу маладых літаратараў Дар'я Маскоўская, у работах удзельнікаў можна вылучыць жанравую перавагу з аднаго боку бытавой прозы, з іншага — фантазіі, фэнтэзі, футуралогіі.

Падчас круглага стала неаднаразова гучала думка пра важнасць падтрымкі маладых літаратараў і пра тое, як спрыяюць гэтаму разнастайныя творчыя спаборніцтвы з магчымасцю апублікаваць напісанае. Пра тое, які ўплыў аказвае гэта на саміх аўтараў, разважала і **беларускі аўтар Маргарыта ЛАТЫШКЕВІЧ.**

— Асабліва хочацца сёння сказаць пра значэнне конкурсаў рознага кшталту, якія, як і згаданы «Мост дружбы», становяцца прыступкай у будучае, у прафесію. Творчае спаборніцтва дае матывацыю для пісьменніцтва і самасцвярджэння. Не менш важная для пісьменніка, асабліва для юнага, і магчымасць публікавацца, — сказала Маргарыта Латышкевіч. — У сувязі з гэтым мне хочацца згадаць пра літаратурныя часопісы. У Беларусі іх не так шмат, але, напрыклад, той жа часопіс «Маладосць» стаў і застаецца добрым стартам для многіх маладых пісьменнікаў. Таму будучыня — яна не недзе там далёка, а тут, побач. І мы працуем на яе, калі ў сілах стварыць платформу для тых, хто будзе працягваць пісьменніцкую, журналісцкую, выдавецкую справу.

У сваю чаргу **пісьменніца, рэжысёр, драматург Алена БЕЛАНОЖКА,** якая дзевяць гадоў таму была ўдзельніцай першага конкурсу «Мост дружбы», звярнулася да прысутных калег і гасцей з прапановай задумацца над важнымі і актуальнымі ў розныя часы тэмамі, дзе важна пісьменніка, яго аўдыторыю і творчасць разглядаць комплексна з улікам тэндэнцыі літаратуры і выдавецкай справы:

— Ці думаем мы пра тое, які наш будучы чытач, нават калі ён зараз толькі падрастае? Ці ўспрымае аўдыторыя сёння вялікія тэксты, ці чытаць у такіх аб'ёмах яна зусім не прывыкла? Можа, варта пераходзіць да нейкіх больш простых формаў. Мы пішам сёння, арыентуючыся на ўсё гэта, таму што глядзім у будучыню і імкнёмся зразумець, ці будзем мы цікавыя зараз і праз гады. Важна таксама ўлічваць і тое, як змяніцца кніга з часам, і якога чытача мы хочам выхаваць. Хвалюе і тое, ці павінны мы ісці за аўдыторыяй і стварыць для чытачоў нешта больш зразумелае, каб яны чыталі, а не сыходзілі ў інтэрнэт. І ў мяне пакуль няма адказаў на гэтыя пытанні, але, думаю, калі пісьменнікі разам паразважаюць над імі, то мы зможам выбудаваць нейкую стратэгію і разуменне, да чаго мы прыйдзем у будучыні.

**Алена ДРАПКО.**

Мясцовы час

# Інскрыпты эпохі

## Іх можна ўбачыць у Доме-музеі Адама Міцкевіча ў Навагрудку

**Шэсцьдзясят дзве кнігі з аўтарскімі падарункавымі надпісамі з асабістай бібліятэкі дырэктара музея Мікалая ГАЙБЫ — гэта своеасаблівы аповед пра наш час, яго выдатных асоб, пра багацце беларускай зямлі наталенты. Мікалай Гайба кажа, што сам не ставіў мэту атрымаць інскрыпты. Значную частку кніг аўтары прывозілі ў Навагрудак, а жаданне падарыць іх нярэдка ўзнікала падчас гутаркі з дырэктарам музея. Напэўна, гэта натуральна — дзяліцца з творчым чалавекам вынікам сваёй працы.**



Першыя кнігі Мікалай Гайба атрымаў яшчэ падчас вучобы на гістарычным факультэце Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта — ад аўтараў, якія сустракаліся з тагачаснымі студэнтамі, падчас паэтычных вечарын у Доме літаратара. Потым — ад былых аднакурснікаў. З некаторымі аўтарамі Мікалай Гайба пазнаёміўся ў Інстытуце гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук. Ён асабіста ведаў такіх вядомых беларускіх гісторыкаў, як Мікола Ермаловіч і Міхаіл Касцюк. Кнігі, што ўвайшлі ў экспазіцыю «Аўтографы жыцця, аўтографы творчасці» — толькі меншая частка з асабістага збору, кніг з аўтарскімі надпісамі ў Гайбы больш за 150.

Некаторыя экспанаты — гісторыя шматгадовых добрых адносін. Сярод такіх — кнігі Вячаслава Чамярыцкага, ганаровага грамадзяніна Навагрудскага раёна Мікалая Нікалаева, які цяпер жыве ў Санкт-Пецярбургу... Аўтографы гэтых людзей вельмі дарагія сэрцу Мікалая Гайбы.

— Чалавеку ўласціва дзяліцца плёнам сваёй працы, — заўважае дырэктар музея, сам аўтар шматлікіх работ пра гісторыю Навагрудчыны, якія ён таксама з радасцю падпісвае калегам і цікавым суразмоўцам. — Мэта гэтай выстаўкі — пазнаёміць наведвальніка з цікавымі кнігамі і нагадаць пра людзей, вядомых у сусветнай і айчыннай гістарыяграфіі і літаратуры.

**Паліна ДЗІСКО.**

# ПАЎНОЧНЫ ВІНАГРАД

## У некаторых атрымліваецца вырасціць «сонечную ягаду» і ў нашым клімаце



Амерыканскі сорт «Альфа» ў цёплых краінах вырастае вось такі. А ў нас — не выспявае. Дачнікі вырошчваюць яго часцей за ўсё з дэкаратыўнымі мэтамі.

**Вінаград нельга назваць зусім чужой айчынным садаводам культурай. На тэрыторыі нашай краіны вінаградарства мае дастаткова доўгую гісторыю, якую сёння працягваюць энтузіясты.**

Лазу, якая ў нашай свядомасці трывала асацыюецца з цёплым кліматам і вінаробнымі краінамі, пачалі актыўна вырошчваць на беларускай зямлі яшчэ пры Боне Сфорца, у XVI стагоддзі. Менавіта каралева польская і вялікая княгіня літоўская, што да замужжа насіла тытул прынцэсы міланскай, стала актыўна развіваць вінаградарства ў ВКЛ. Другі штуршок вырошчванню вінаграду на беларускіх палях быў дадзены ўжо ў XX стагоддзі — у 1960-я, пры Хрушчове. Тады на поўдні нашай краіны, у Брэсцкай і Гомельскай абласцях, былі створаны цэлыя калгасы, якія спецыялізаваліся на вырошчванні вінаграду. Сёння прамысловыя вінаграднікі ў Беларусі ёсць толькі на Пінскім вінзаводзе. А вінаградарства ў нашай краіне развіваюць аматары.



У некаторых энтузіястаў атрымліваецца вырошчваюць на Беларусі вінаград — і вінаграднікі даюць добры ўраджай.

### ЛАЗА, ЯКАЯ ДОРЫЦЬ МАЛАДОСЦЬ

У НДІ пладаводства ў Самахвалавічах сабрана калекцыя з больш чым 500 сартоў вінаграду. А на дачных і прысядзібных участках сяброў клуба «Паўночны вінаград» расце каля 800 сартоў — і гэты спіс пастаянна пашыраецца.

— Клуб існуе з 2000 года, — расказвае яго цяперашні **старшыня, навуковы супрацоўнік аддзела селекцыі пладовых культур РУП «Інстытут пладаводства» Уладзімір УСЦІНАЎ**. — Арганізаваў клуб 20 гадоў таму доктар сельскагаспадарчых навук Рамуальд Лойка. Цяпер у сувязі з пандэміяй мы прыпынілі пасяджэнні, але ў найбліжэйшыя дні адновім іх.

Тым больш што люты — час абмену чаранкамі вінаграду і іх укаранення, каб маладая расліна паспела падужэць перад пасадкай.

— Удзельнікі нашага клуба — а гэта больш за 150 чалавек — у асноўным людзі сталага ўзросту, за 50 гадоў. Але ёсць у Беларусі і маладыя вінаградары, і мы трымаем з імі сувязь, — расказвае суразмоўнік.

Вінаград — культура працаёмкая і ў нашым клімаце — грашова затратная. Што прымушае людзей спрабаваць увасобіць у жыццё забыты савецкі лозунг «На Марсе будуць яблыні квітнець!»?

Вінаград жыве ад 50—70 да 100 гадоў — пры добрым доглядзе гэта вельмі даўгавечная расліна. А неабходнасць у нашых набліжаных да экстрэмальных для гэтай расліны ўмовах пастаянна клапаціцца аб цеплалюбівых кусціках, як аб хваравітым дзіцяці, дае пажылым людзям матывацыю і не дазваляе зацыкліцца на ўласных праблемах, кажа Уладзімір Усцінаў. Пенсіянеры з клуба вінаградараў цэняць магчымасць адчуць сябе датычным да карыснай справы — развіцця беларускага вінаградарства. Плюс зносіны з аднадумцамі. Гэта дорыць пажылым людзям сілы жыць і не здавацца ў палон узросту, бо старэць няма калі — хутка новы дачны сезон. А для маладых вінаградараў гэта свайго роду выклік — вырасціць цеплалюбівую культуру далёка за межамі іх кліматычнай зоны і атрымаць ураджай.

### КОЛЕР І СМАК

Старшыня клуба беларускіх вінаградараў Уладзімір Усцінаў узначальвае кірунак развіцця вінаградарства і ў НДІ пладаводства. Ён кажа, што ў беларускім клімаце можа расці больш за тысячу сартоў і гібрыдных форм гэтай культуры. З усяго гэтага багацця на сённяшні дзень у Дзяржаўны рэестр сельскагаспадарчых раслін Беларусі ўнесены 17 сартоў вінаграду, раянаваных у нашай краіне. Уласнай селекцыяй цеплалюбівай культуры, не прыстасаванай для нашых умоў, беларускія навукоўцы не займаюцца, іх задача — інтрадукцыя сартоў вінаграду, выведзеных у іншых краінах, то-бок вывучэнне іх паводзінаў у нашай кліматычнай зоне. Зрэшты, селекцыяй займаюцца некаторыя энтузіясты-садаводы на сваіх сотках.

Сталовыя сарты вінаграду ў Беларусі вырошчваць праблематычна.

— Трэба разумець, што мяжа зімаўстойлівасці сталовых сартоў — мінус 24 градусы. А ў гэтым лютым, напрыклад, дзе-нідзе па краіне ўжо была зафіксаваная тэмпература -31, — адзначае спецыяліст. — Каб атрымаць ураджай, такі вінаград важна накрываць на зіму — таму сталовыя сарты ў Беларусі практычна непрыдатныя для прамысловага вырошчвання.

А прыватнікі вырошчваюць сталовы вінаград паспяхова — сарты ранняга тэрміну паспявання «Красуня», «Антрацыт» (народная назва «Чарлі»), «Лізавета», «Юпітэр», «Цытрын», «Кадранка»... Вырошчваюць і больш цеплалюбівыя сарты — ў цяпліцах. Як правіла, ураджай сартоў позняга тэрміну паспявання добра захоўваецца пры халодных станоўчых тэмпературах (як яблыкі): здымаеце гронкі ў канцы верасня — кастрычніку і ясце аж да сакавіка. І можна забяспечыць сабе, напрыклад, шыкоўную раніцу 1 студзеня з уласным вінаградам. А можна — і з уласным вінаградным віном.

Дарэчы, аб віне. Так званыя тэхнічныя сарты (створаныя адмыслова для вытворчасці соку і віна) менш патрабавальныя і лепш растуць у нашым клімаце. Калі сталовыя сарты ў нашых вінаградараў у асноўным «родам» з поўдня Расіі і з Украіны, то ў «тэхнічным» сегменце цалкам чакана пераважаюць дасягненні французскіх селекцыянераў: сарты «Маршал Фош», «Ляон Міё». Таксама вырошчваюць айчынныя энтузіясты-вінаробы амерыканскія сарты вінаграду — «Маркет», «Скандзія», «Франціньяк»; «Рэгент» і «Салярыс» нямецкай селекцыі, венгерскія «Крышталь», «Біянка», «Агрыя».

### СВАЁ ВІНО

— Развіццю вінаградарства ў нашай краіне перашкаджае і адсутнасць закона аб вінаградзе і віне, — мяркуе суразмоўнік. — Дакументы, якія рэгулююць на заканадаўчым узроўні вытворчасць і продаж віна прыватнымі асобамі, што маюць уласныя вінаграднікі, існуюць ва ўсіх сумежных з Беларуссю дзяржавах. Прыняцце такога закона ў нашай краіне магло б стаць штуршком да развіцця беларускага вінаградарства. А цяпер важдацца з вінаградам у прамысловым маштабе для многіх проста няма сэнсу. Ёсць, вядома, энтузіясты, але іх мала.



Вытворчасць уласнага вінаграднага віна — яшчэ адзін фактар, што робіць вінаградарства прывабным для садаводаў.

Вытворчасць уласнага віна — яшчэ адзін фактар, які робіць вінаградарства прывабным для тых, хто ім захапляецца. Цалкам «экалагічна чыстае» віно з вінаграду, дарэчы, атрымаць амаль немагчыма.

— Вырошчваць вінаград абсалютна без апрацовак праблематычна — ён будзе хварэць, — кажа спецыяліст. — Але прыватнікі робяць 3-4 апрацоўкі ў сезон, а на прамысловых вінаградніках колькасць апрацовак можа дасягаць 20 і больш.

І ўсё ж віно з уласнага ўраджаю вінаграду (калі ўсё было зроблена правільна), карыснейшае за многія з тых вінаў, што вырабляюцца прамысловым спосабам.

— Набываючы віно ў краме, мы можам толькі спадзявацца на добрасумленнасць вытворцы, — адзначае Уладзімір Усцінаў. — Хімічная прамысловасць у нашы дні актыўна развіваецца: часам прасцей вырабіць напой, змяшаўшы ваду, спірт, смакавая дабаўка і фарбавальнік, і наўрад ці, калі вы не самелье, зможаце адрозніць па смаку такую падробку ад сапраўднага віна. А вырасціўшы вінаград сваімі рукамі і зрабіўшы з яго віно, вы будзеце ўпэўненыя ў якасці прадукту.

Тэхналогія вытворчасці дамашняга вінаграднага віна складаная і мае шмат нюансаў і тонкасцяў. Віно, зразумела, павінна быць натуральнае, без дадавання цукру — толькі ягады і вінныя дрожджы (прычым колькасць дрожджэй розная для кожнага сорту вінаграду). Можна абысціся і без дрожджэй, толькі ягадный масай. Але ў гэтым выпадку віно не атрымаецца, калі, напрыклад, сабраць ягады адразу пасля дажджу: вада змые бязважкі налёт на іх паверхні, так званыя «дзікія дрожджы».

Якое вінаграднае віно можна зрабіць у дамашніх умовах? У асноўным сухое і паўсухое, белае і чырвонае. Па цукрыстасці вінаград, вырашчаны ў нашых шыротах, не параўнаецца з паўднёвым, і каб атрымаць паўсалодкае віно, у вінаматэрыял дадаюць фруктозу. Ёсць сарты вінаграду, віно з якіх ужываецца маладым, ёсць і тыя, напоі з якіх трэба вытрымліваць. Некаторыя энтузіясты-вінаробы вытрымліваюць у дубовых бочачках віно з уласнага вінаграду 5, 10 і нават больш гадоў, расказвае Уладзімір Усцінаў. У гэтым выпадку штогод праводзіцца пераліў і дэгустацыя напою, каб пераканацца, што няма пагаршэння яго якасці.

Зрэшты, турбавацца з вытворчасцю ўласнага віна зусім не абавязкова. Самы просты і нескладаны спосаб вырошчвання вінаграду айчыннымі дачнікамі — проста як дэкаратыўнай культуры. Дарэчы, звыклая лаза, што абвівае дачныя альтанкі, з зеленавата-сінімі гронкамі і дробнымі ягадамі («для прыгажосці», а не для таго, каб іх есці) — гэта вінаград амерыканскага сорту «Альфа» (у народзе «Ізабэла»). Проста ў нас ён не выспявае да чарнаты.



**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**

## Извещение о проведении 25 марта 2021 года торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «МАЗ – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ»

Сведения о предмете торгов (продаваемом имуществе)

| № предмета торгов | Наименование имущества | Год выпуска | Инвентарный номер | Номер шасси | Начальная цена, бел. руб., без учета НДС | Размер задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Седельный тягач МАЗ-544008 | 1999 | 5003426 | Y3M544008X0000020 | 4 023,78 | 400,00 |
| 2 | Полуприцеп МАЗ-931010 | 2002 | 5003529 | Y3M93101020000002 | 2 500,20 | 200,00 |
| 3 | Полуприцеп МАЗ-933014 | 2006 | 5003570 | Y3M93301460000083 | 3 041,09 | 300,00 |
| 4 | Полуприцеп МАЗ-933014 | 2006 | 5003571 | Y3M93301460000082 | 3 041,09 | 300,00 |
| 5 | Седельный тягач АЗ-544008-320-021 | 2003 | 5003601 | Y3M54400830000212 | 3 239,24 | 300,00 |
| 6 | Седельный тягач МАЗ-643008-029-011 | 2006 | 5003727 | Y3M64300860000285 | 16 315,52 | 1 600,00 |
| 7 | Седельный тягач МАЗ-643008 | 2001 | 5003845 | Y3M64300810000022 | 12 397,89 | 1 200,00 |
| 8 | Седельный тягач МАЗ-642208-230 | 2006 | 5003846 | Y3M64220860004647 | 4 005,58 | 400,00 |
| 9 | Седельный тягач МАЗ-543287-220 | 2006 | 5003847 | Y3M54328760000021 | 5 287,53 | 500,00 |
| 10 | Бортовой МАЗ-5336А3-221 | 2007 | 5003848 | Y3M5336A370000001 | 6 056,90 | 600,00 |
| 11 | Бортовой МАЗ-5336А5 | 2007 | 5003850 | Y3M5336A570000021 | 10 330,40 | 1 000,00 |
| 12 | Полуприцеп МАЗ-975800-012 | 2002 | 5003852 | Y3M97580020004767 | 5 565,56 | 500,00 |
| 13 | Седельный тягач МАЗ-5440А9-320-031 | 2008 | 5003870 | Y3M5440A980000023 | 22 898,14 | 2 200,00 |
| 14 | Седельный тягач МАЗ-544008-030-021 | 2005 | 5003871 | Y3M54400850001737 | 14 063,01 | 1 400,00 |
| 15 | Седельный тягач МАЗ-544008 | 2006 | 5003951 | Y3M54400860002344 | 10 075,63 | 1 000,00 |
| 16 | Бортовая МАЗ-6312А8 | 2008 | 5003819 | Y3M6312A880000115 | 16 973,68 | 1 600,00 |
| 17 | Бортовая МАЗ-5340Е9 | 2008 | 5004123 | Y3M5340E980000001 | 4 181,50 | 400,00 |
| 18 | Полуприцеп МАЗ-975830 | 2005 | 5003702 | Y3M97583050000999 | 4 564,67 | 400,00 |
| 19 | Полуприцеп МАЗ-9758 061 | 2001 | 5003839 | Y3M97580010003817 | 4 510,07 | 400,00 |
| 20 | Полуприцеп МАЗ-9758 | 2001 | 5003206 | Y3M97580010003505 | 2 434,49 | 200,00 |
| 21 | Полуприцеп МАЗ-975800 | 2007 | 5003704 | Y3M97580070010049 | 4 391,78 | 400,00 |
| 22 | Автобус МАЗ-256300 | 2006 | 5003667 | Y3M25630060000609 | 9 849,16 | 900,00 |
| 23 | Бортовой МАЗ-437043-328 | 2008 | 5003832 | Y3M43704380000633 | 5 061,07 | 500,00 |
| 24 | Бортовой МАЗ-437043-328 | 2008 | 5003834 | Y3M43704380000629 | 5 790,00 | 500,00 |
| 25 | Автобус МАЗ-152021 | 2003 | 5003396 | Y3M15202130000139 | 8 775,48 | 800,00 |
| 26 | Прицеп МАЗ-870100-3010 | 2008 | 5003822 | Y3M87010080000014 | 6 255,06 | 600,00 |
| 27 | Седельный тягач МАЗ-544008 | 2008 | 5003744 | Y3M54400880006124 | 9 575,18 | 900,00 |
| 28 | Седельный тягач МАЗ-544008 | 2008 | 5003746 | Y3M54400880006122 | 9 999,80 | 900,00 |
| 29 | Седельный тягач МАЗ-544008 | 2008 | 5003745 | Y3M54400680006125 | 11 978,33 | 1 100,00 |
| 30 | Автобус МАЗ-152021 | 2002 | 5003398 | Y3M15202120000097 | 5 693,95 | 500,00 |
| 31 | Специальная МАЗ-490143 | 2013 | 4520281 | Y3M490143D0000019 | 19 444,56 | 1 900,00 |
| 32 | МАЗ-6303А3 (кс-55727-1) | 2008 | 4253640 | Y3M6303A370000002 | 58 398,39 | 5 800,00 |
| 33 | Бортовая МАЗ-631236 | 2012 | 5004320 | Y3M631236C0000020 | 26 692,42 | 2 600,00 |
| 34 | Полуприцеп МАЗ-975830-3032 | 2006 | 5003902 | Y3M97583060001454 | 8 980,71 | 800,00 |

**Местонахождение имущества:** предметов торгов № 1-15 – г. Могилев, ул. Крупская, 232; предметов торгов № 16-34 – г. Минск, ул. Промышленная, 2.

**Продавец имущества:** ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ», ул. Социалистическая, 2, 220021, г. Минск.

**Организатор торгов:** государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск.

**Условие торгов:** победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 3 процентов от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, в том числе индивидуальные предприниматели, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы: заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток (задатки) перечисляется в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, на расчетный счет № BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, БИК BLBBBY2X, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583, назначение платежа – задаток для участия в аукционных торгах от 25.03.2021 по предмету торгов №__.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и не включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) подписывается в течение 15 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Торги проводятся **25 марта 2021 года в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 23.02.2021 по 19.03.2021** включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.30) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефоны для справок:** (017) 360-42-22 (государственное предприятие «МГЦН»); **по предметам торгов № 1-15:** (029) 675-03-50 (завод «Могилевтрансмаш» ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ»); **по предметам торгов № 16-34:** (017) 395-62-96 (ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ»)

## Информационное сообщение о проведении аукциона

**по продаже гражданам Республики Беларусь в частную собственность земельных участков для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов в деревнях Хотеново, Кальники Усяжского сельского исполнительного комитета Смолевичского района Минской области**

| | | |
|---|---|---|
| 1 | Форма проведения аукциона | открытый |
| 2 | Дата, время и место проведения аукциона | 30 марта 2021, в 11.00, пос. Усяж, ул. Комсомольская, 10<br>Усяжский сельисполком, кабинет председателя |
| 3 | Продавец и его адрес | Усяжский сельский исполнительный комитет, пос. Усяж, ул. Комсомольская, 10 |
| 4 | Земельный участок, его кадастровый номер и адрес | Лот № 1 – земельный участок площадью 0,1500 га в дер. Хотеново, ул. Садовая (объект № 257/2015) № 624885606901000090<br>Лот № 2 – земельный участок площадью 0,1500 га в дер. Кальники, ул. Центральная (участок № 6, объект № 101/2018) № 624885603001000113 |
| 5 | Условия продажи | а) без изменения целевого назначения земельных участков;<br>б) продажа по цене не ниже начальной;<br>в) участниками аукциона могут быть граждане Республики Беларусь, постоянно проживающие на территории Республики, или приравненные к постоянно проживающим в соответствии с законодательством Республики Беларусь;<br>г) при подаче заявления на определенный лот только одним участником, земельный участок продается по начальной цене, увеличенной на 5 %.<br>д) наличие не менее двух участников |
| 6 | Целевое назначение земельного участка | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома |
| 7 | Начальная (стартовая) цена | Лот № 1 – 8 000,00 руб.<br>Лот № 2 – 7 000,00 руб. |
| 8 | Условия аукциона | - продажа по цене не ниже начальной<br>- участниками аукциона могут быть граждане Республики Беларусь, постоянно проживающие на территории республики |
| 9 | Наличие инженерной инфраструктуры | Возможность подключения к газоснабжению – лот № 1<br>Возможность подключения к водоснабжению – лот № 2 |
| 10 | Ограничения в использовании | Лот № 1 – охранная зона электрических сетей |
| 11 | Условия оплаты | Безналичный расчет в течение 10 рабочих дней после подписания протокола по результатам проведения аукциона, без предоставления рассрочки |
| 12 | Сумма задатка и реквизиты продавца | 10 % от начальной (стартовой) цены земельного участка **р/с BY49AKBB36410000006276200000 ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК: AKBBBY2X,** назначение платежа 04901 (с пометкой «задаток за земельный участок»), УНП с/и 600023836 |
| 13 | Порядок предварительного ознакомления в натуре с продаваемыми земельными участками | каждая среда в 10.00 |
| 14 | Начало приема документов | 1 марта 2021 года<br>в рабочие дни: понедельник, вторник, среда, четверг, пятница с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 |
| 15 | Окончательный срок приема документов | 24 марта 2021 года в 17.00 |
| 16 | Контактные телефоны | 8 (01776) 67- 131, 67 – 2 88, 8033 902 71 49 |

Расходы по организации и проведению аукциона: лот № 1 – 1 565 руб. 54 коп., лот № 2 – 1 747 руб. 82 коп. и затраты на публикацию информационного сообщения подлежат возмещению победителем аукциона.

**Затраты на строительство, в том числе проектирование, объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры к земельным участкам, подлежат возмещению в порядке и случаях, предусмотренных в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 7 февраля 2006 г. № 72 «О мерах по государственному регулированию отношений при размещении и организации строительства жилых домов, объектов инженерной, транспортной и социальной инфраструктуры».**

Примечания: для участия в аукционе в адрес продавца необходимо предоставить:

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме.
2. Копии платежных поручений, заверенные банком, подтверждающие внесение задатка на расчетный счет продавца.
3. Физическим лицам – документ, удостоверяющий личность (паспорт) покупателя или его доверенного лица, и доверенность, заверенную нотариально (в случае, если интересы покупателя представляет это лицо).

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ
### Унитарное предприятие «Могилевское отделение БелТПП» 24 марта 2021 в 14.00 проводит торги по продаже следующего объекта

**Лот № 1:** капитальное строение с инвентарным номером 723/С-10440, площадью – 544,4 кв. м, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – арочник, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 724683604301000055 по адресу: Могилевская обл., Мстиславский р-н, Подсолтовский с/с, д. Нестерово, ул. Советская, 19А.

***Начальная цена продажи лота №1 составляет без учета НДС (20 %): 6700,00 (шесть тысяч семьсот белорусских рублей 00 копеек),*** *задаток 670,00 (шестьсот семьдесят белорусских рублей 00 копеек).*

**Собственник имущества:** открытое акционерное общество «Натопа-Агро», 213481, Мстиславкий р-н, Могилевская обл, аг. Подсолтово, тел. для осмотра объектов продажи (8-02240) 53-115.

**Организатор торгов:** унитарное предприятие по оказанию услуг «Могилевское отделение Белорусской торгово-промышленной палаты», г. Могилев, ул. Циолковского, 1, сайт: www.mogilevcci.by.

**Место проведения торгов:** г. Могилев, ул. Циолковского, 1, к. 203, Унитарное предприятие «Могилевское отделение БелТПП».

Лот № 1 продаются без условий на торгах в форме открытого аукциона с применением метода повышения начальной цены, с шагом 5 (пять) процентов от предыдущей названной аукционистом цены. Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору торгов в сроки, указанные в извещении, следующие документы: заявление на участие в торгах; копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); доверенность представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения торгов; соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения торгов (в двух экземплярах); копию платежного поручения о внесении задатка, заверенную банком. Задаток перечисляется на расчетный счет унитарное предприятие «Могилевское отделение БелТПП» р/с № BY55PJCB30123018571000000933 в «Приорбанк» ОАО, ЦБУ 300 г. Могилев, BIC: PJCBBY2X, УНП 700016628; физическим лицам – предъявить паспорт; иные документы в соответствии с Положением о порядке организации и проведения торгов по продаже объектов, находящихся в собственности юридических лиц и индивидуальных предпринимателей Республики Беларусь, организуемых унитарным предприятием «Могилевское отделение Белорусской торгово-промышленной палаты».

**Условия регистрации, участия в торгах размещены на интернет-сайте продавца по адресу: www.mogilevcci.by.**

**Срок заключения договора купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем)** – в течение 10 календарных дней после проведения торгов.

Срок оплаты предметов торгов на условиях заключенного договора купли-продажи.

Торги состоятся в 24 марта 2021 г. в 14.00 по адресу: г. Могилев, ул. Циолковского, 1, к. 203, Унитарное предприятие «Могилевское отделение БелТПП».

Срок подачи заявления: с момента выхода публикации настоящего извещения в рабочие дни с 9.00 до 12.00 и с 14.00 до 15.00 по адресу: г. Могилев, ул. Циолковского, 1, к. 104. Последний срок подачи заявления – 23 марта 2021 до 12.00.

Регистрация участников торгов 24 марта 2021 с 13.30 до 14.00 по адресу: г. Могилев, ул. Циолковского, к. 104, унитарное предприятие «Могилевское отделение БелТПП».

Телефоны для справок: (0222) 778042, + 375 0296927492 (А1).

Дополнительная информация размещена на сайте организатора в разделе «торги» по адресу: www.mogilevcci.by.

## Информация о продаже жилого дома без проведения аукциона

Будславский сельский исполнительный комитет производит продажу одноквартирного жилого дома согласно Указу Президента Республики Беларусь № 357 от 04.09.2018 г. «О пустующих и ветхих домах»

| № п/п | Наименование | Адрес | Рыночная стоимость объекта (бел. руб.) | Затраты по оформлению и продаже |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Объект недвижимости: капитальное строение (жилой дом) 51,3 кв. м с инвентарным номером 633\С-1445 на земельном участке с кадастровым номером 624080607101000034 | Республика Беларусь Минская область, Мядельский район, Будславский с\с, д. Полесье, 7 | 3100,00 белорусских рублей (три тысячи сто белорусских рублей 00 копеек) | 283,54 белорусского рубля (двести восемьдесят три белорусских рубля пятьдесят четыре копейки) плюс затраты за размещение объявления |

Продажа проводится без проведения аукциона. При подаче заявления с гражданином заключается договор купли-продажи жилого дома.

При наличии нескольких претендентов на приобретение пустующего дома, его отчуждение будет осуществляться по результатам аукциона.

Заявления принимаются по адресу: 222374 ул. Советская, 13, агрогородок Будслав, Мядельского района, Минской области.

Телефон для справок (8-017-97) 22-9-06, 31-4-97; эл\почта budslav.selispolkom@yandex.by.

УНП 600097423.

Яшчэ раз пра пільнасць

# «Я вас не чакала»



## Чаму людзі, нават 35-гадовыя, не кажучы пра старэйшых, лёгка «вядуцца» на віртуальных махляроў

**Ну вось нарэшце і мне патэлефанавалі. А то амаль усе калегі, усе знаёмыя ўжо камунікавалі з вайбернымі «супрацоўнікамі Беларусбанка», якія папярэджваюць пра спробы спісання грошай з карткі. Днямі, напрыклад, з прадстаўніцай Столінскай сацыяльнай службы размаўляла, дык яна расказвала, як яе страшылі, маўляў, з вашай карткі спрабуюць разлічыцца ў краме Масквы. Мне сказалі проста, што зафіксавана дзве спробы спісання сродкаў з маёй банкаўскай карткі.**

### Дыктуюць нумар

Але я была падрыхтаваная да такой камунікацыі. І ад мяне ён дакладна не чакаў пачуць:

— Я так чакала вас, так даўно чакала! — гаварыла з прыдыханнем, горача, згадаўшы ўвесь свой досвед школьна-самадзейнага тэатра. Хлопец на тым канцы Viber крыху сумеўся. Але ненадоўга, потым зноў стаў гаварыць, праўда, без папярэдняга наступальнага імпэту. А калі я сказала, што меней за мільён на картцы не трымаю і цалкам упэўненая ў трох ступенях абароны, суразмоўнік яшчэ больш засумаваў. Праўда, ён яшчэ раз паспрабаваў загаварыць гулліва, нібы ў тон мне, але, здаецца, канчаткова зразумеў, што тут не свеціць. Карацей, да прапановы паведаміць нумар карткі ды іншыя даныя так і не дайшло. Ды і ніхто з маіх знаёмых на гэтую дурніцу, што называюць замежным словам «вішынг», не папаўся. Ну стольк ж пішацца, гаворыцца, дзіўна было б — скажаце вы. Вось і мне дзіўна, гэта калі вельмі мякка сказаць, было чытаць зусім нядаўна ў зводках здарэнняў пра біду 34-гадовай брастаўчанкі.

Прайдзісвет пазваніў ёй на Viber 8 лютага з дзяжурным тэкстам пра тое, што нехта спрабуе спісаць з яе банкаўскага рахунку буйную суму. А для таго каб спыніць незаконную аперацыю, яна павінна паведаміць рэквізіты банкаўскай карткі. Жанчына, нібы адурманеная віртуальным ілжэбанкірам, прадыктавала ўсе звесткі. Пасля гэтага з яе сумеснага з мужам рахунку было ўкрадзена больш за 43 тысячы рублёў.

Ну я яшчэ магу дапусціць, што магчыма з наскоку пераканаць вясковую бабульку ці зусім пажылую гарадскую пенсіянерку, ды і то яны цяпер пільныя. Але каб маладая сучасная жанчына... Магу дапусціць, што яна газет не чытае, тэлевізар не глядзіць. Няўжо інфармацыйныя сайты не адкрывае? Цяпер жа, здаецца, кожны прас расказвае пра віртуальных махляроў, і ў канцы кожнага паведамлення даюцца рэкамендацыі, як сябе паводзіць. Зноў жа, сума на рахунку гаворыць за тое, што дама не прадстаўніца сацыяльнага дна, якая жыве ў інфармацыйным вакууме, працуюць з мужам, даход маюць.

Толькі ж нядаўна, тыдні за два да яе біды, усе брэсцкія сайты паведамлялі, як пацярпела 48-гадовая брастаўчанка. Цікава, што незнаёмец у гэтым выпадку гаварыў кабеце аб спробе спісання з рахунку, адкрытага не ў тым банку, дзе яна трымае грошы. Яна сама потым назвала і банк, і звесткі па карце. Адным словам, укралі ў яе звыш 16 тысяч рублёў...

Дапусціць, што наша маладая гераіня працавала недзе за мяжой, прыехала толькі-толькі, не ведае пра размах віртуальных махляроў, зусім не выходзіць. Пандэмія, ніхто асабліва не ездзіць. Тады што? Не знаю, няма ў мяне адказу. Хіба толькі яны выкарыстоўваюць нейкія прыёмы вытанчанага псіхалагічнага ціску, накшталт гіпнозу, што на асобных людзей дзейнічае.

### Ветлівыя калектары

І галоўнае, што гэтыя махляры надзвычай знаходлівыя, увесь час мяняюць тактыку, удасканальваюць формы і метады. Вось цяпер яны нярэдка рэкамендуюцца «калектарамі» — работнікамі службы па спагнанні даўгоў. Такія выпадкі зафіксаваныя ў вобласці — паведамілі ў Брэсцкім абласным УУС. І нагадалі, што ў дзеючым заканадаўстве РБ няма азначэння калектара, калектарскай дзейнасці альбо калектарскага агенцтва, а пытанні па спагнанні даўгоў адрэгуляваны і дакладна прапісаныя.

А махляры ў спадзяванні на прававую неадукаванасць, у справядлівым, дарэчы, спадзяванні з энтузіязмам узяліся за асваенне новага кірунку. Яны тэлефануюць на месенджар, рэкамендуюцца калектарамі (слова нашы грамадзяне ведаюць па расійскіх серыялах. — **Аўт.**) і паведамляюць аб наяўных запазычанасцях.

Яны запэўніваюць суразмоўцу, што той мае даўгі перад банкам, фірмай па мікрапазыках, альбо яго сваякам трэба тэрмінова выкупіць маёмасць у ламбардзе. Тэлефонныя абаненты не размаўляюць груба, не пагражаюць, яны падкрэслена ветлівыя, яны просяць выплаціць доўг, перавесці грошы на іх рахунак. Інакш... яны будуць вымушаны нанесці візіт даўжніку. Далей наш чалавек успамінае сюжэты памянёных серыялаў, пужаецца і пераводзіць грошы сам і добраахвотна. На жаль, былі такія выпадкі.

Супрацоўнікі праваахоўных органаў раяць найперш захоўваць спакой. Атрымаць больш інфармацыі пра таго, хто пазваніў: запісаць яго імя і прозвішча, месца работы, пасаду, нумар тэлефона, а потым сказаць, штоператэлефануеце і пакласці трубку. І галоўнае, не варта плаціць невядома каму па званку, нават калі вы маеце рэальныя даўгі. Яны ж нікуды не дзенуцца нават пасля таго, як адорыце махляроў.

### «Генерал» з часовымі праблемамі

Пра віртуальных «палкоўнікаў» і «генералаў» песня старая, але, здаецца, ёй не будзе канца. Пісала, памятаю, на гэтую тэму калонку гады са два таму. Калегі пісалі і раней, і пазней. Здаецца, ужо ўсіх «паняў крышку ў гадах» праінструктавалі, як трэба вуха трымаць востра з палкоўнікамі, і асабліва генераламі, і асабліва ўзброеных сіл ЗША, якія стаміліся ад вайны і паходаў, так хочуць спакою і ласкі ад добрых беларускіх жанчын. Яны ж такія фатаграфіі дасылаюць: мужныя твары, гонар і годнасць у вачах, баявыя ўзнагароды ў тры рады... Спадарыні, ім не ласка ваша патрэбная, а вашы грошы.

Здымак героя вашага рамана можна загугліць і знайсці ў інтэрнэце. Ну а калі махляр профі, можа, і не знойдзеце, то хоць звярніце ўвагу на тэкст. Сапраўднаму вайскоўцу больш да твару было б класічнае: «Я салдат. І не знаю слоў любові», а не саладкаватасаплівыя маналогі пра вашу прыгажосць і дабрыню, зноў жа інтэрнэтнага паходжання, якія сотнямі ці, можа, тысячамі рассылаюцца дурніцам ва ўсе канцы свету.

Перапіска часам цягнецца месяцамі. І жанчына так пранікаецца пачуццямі да свайго «генерала-мільянера», што па першым яго закліку бяжыць і пераводзіць грошы. Бо ў яго раптам узнікаюць фінансавыя праблемы, часовыя, вядома.

Паводле слоў начальніка аддзела Брэсцкага абласнога УУС Андрэя ХРЫСЦЮКА, часцей за ўсё жанчыны пералічваюць грошы на рахункі, якія адкрыты ў краінах Афрыкі. Ён жа ваюе недзе ў Сахары, як яму не дапамагчы, нават калі і з невялікай пенсіі?

Летась брастаўчанка некалькі разоў пералічвала грошы на падазроны замежны рахунак. Супрацоўніцы банка ёй казалі, што аддае грошы махляру, яна не паверыла ім. За тры разы сума пераводаў перавысіла 1000 долараў. Потым яна ўсё ж прыйшла ў міліцыю. Чаго ўжо было ісці? А іншыя, думаю, і не прыходзяць.

Адной такі вось «генерал» сам прыслаў картку з «мільёнам долараў» на рахунку. І папрасіў яе разблакіраваць, здзейсніць невялікую пакупку. Калі гэта не атрымалася зрабіць у вашай краіне, не страшна, пісаў ён. Каханы далей паведаміў, што трэба звярнуцца да «спецыялістаў-міжнароднікаў», яны за пэўную суму збяруць патрэбны пакет дакументаў, каб пацвердзіць легальнасць грошай, тады яна атрымае запаветны мільён. І яна плаціла «міжнароднікам».

Калі ўсім сэрцам верыць у такія вось выкрунтасы авантурыстаў, то як кажа адзін мой калега: «Нічым нельга дапамагчы. Гэта ўжо клініка, дыягназ». Не кажу ўжо пра тых, якія высылаюць махлярам інтымныя фота ў доказ сваіх пачуццяў. І ўсё гэта разам наводзіць на сумныя разважанні. Калі людзі так лёгка вераць любому віртуальнаму махляру, незнаёмаму тэлефоннаму абаненту, лёгка паддаюцца на ўгаворы, значыць людзьмі не вельмі цяжка маніпуляваць наогул.

Так што чакайце, калі вам патэлефануюць альбо напішуць. Але чакайце, каб зламыснік, а не вы, застаўся ні з чым.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

---

Крымінал. Здарэнні

## Падмануў і пакупніка, і прадаўца аўто

**У аператыўна-дзяжурную службу Ленінскага РАУС Магілёва звярнуўся 24-гадовы гараджанін. Хлопец расказаў, што быў падмануты знаёмым з твару мужчынам, які прапанаваў яму дапамогу ў куплі аўтамабіля.**

Па інфармацыі УУС Магілёўскага аблвыканкама, «памочнік» запэўніў даверлівага магілёўца, што зможа знайсці прыдатную для яго па цане машыну, праўда, пры гэтым папрасіў унесці грашовы заклад, які неабходны для аплаты ўладальніку жаданай пакупкі. Пасля таго як у рукі новага знаёмага перайшло 1350 рублёў, той перастаў адказваць на званкі і паведамленні ў сацыяльных сетках. Страціўшы надзею, пазбавіўшыся грашовых сродкаў, так і не атрымаўшы жаданага аўто, ашуканы малады чалавек звярнуўся па дапамогу да праваахоўнікаў.

Праз пару дзён у органы ўнутраных спраў прыйшоў яшчэ адзін 38-гадовы гараджанін, індывідуальны прадпрымальнік, які пазбавіўся і аўтамабіля, і грашовых сродкаў у памеры 2500 долараў. Агульная прычыненая шкода была ацэнена ў 6025 рублёў. Аказалася, што мужчына шукаў пакупніка для свайго аўтамабіля, які знаходзіўся ў тэхнічна няспраўным стане, і ў працэсе пошукаў пазнаёміўся з грамадзянінам, які абяцаў яму дапамогу з продажам машыны. Праз пару дзён новы знаёмы радасна абвясціў, што знайшоў пакупніка, аднак неабходныя былі грошы, каб адрамантаваць выстаўлены на продаж аўтамабіль. Уладальнік пагадзіўся, аддаў сродкі і машыну, аднак больш ён не бачыў ні пасярэдніка, ні сваёй маёмасці з грашыма. Тады мужчына таксама вырашыў звярнуцца па дапамогу да праваахоўнікаў.

Міліцыянеры высветлілі, што ў абодвух выпадках фігуруе адзін і той жа мужчына — 27-гадовы нідзе не працуючы, раней ужо судзімы за махлярства магілёвец, які зноў вырашыў зарабіць лёгкім і звыклым для яго злачынным спосабам. Аказаўшыся пасярэднікам для незнаёмых паміж сабой прадаўца і пакупніка, ён узяў і ў аднаго, і ў другога грошы, забраў аўтамабіль, а пасля знік, пакінуўшы двух мужчын здзіўлянца.

## Паквапіўся на суседскае мяса

**У Барысаўскім раёне вясковец, не знайшоўшы ў доме нічога каштоўнага, украў у суседкі сем кілаграмаў свініны.**

З заявай аб крадзяжы ў аператыўна-дзяжурную службу райаддзела міліцыі звярнулася 58-гадовая жыхарка вёскі Ніўкі. Яна паведаміла, што невядомы, падабраўшы ключы, пракраўся ў яе дом і з маразільнай камеры ўкраў мяса.

Як высветлілі праваахоўнікі, да злачынства мае дачыненне 23-гадовы сусед пацярпелай. Раней мужчына да крымінальнай адказнасці не прыцягваўся, аднак вёў асацыяльны лад жыцця: доўгі час нідзе не працаваў, злоўжываў спіртным, паведамляе група інфармацыі і грамадскіх сувязяў Барысаўскага РУУС.

Міліцыянеры ўстанавілі, што так званага ўзлому дзвярных замкоў не было. Падазраваны адкрыў дом гаспадарскім ключом, які, дарэчы, ляжаў пад дыванком каля дзвярэй. Пайсці на крадзеж вясковец адважыўся ў той момант, калі заяўніца была ў гасцях.

Пранікнуўшы ўнутр дома пацярпелай і не знайшоўшы для сябе нічога каштоўнага, няпрошаны госць наткнуўся на маразільную камеру, адкуль і дастаў раскладзенае ў некалькі пакетаў мяса. Несці да сябе ў дом крадзенае не рызыкнуў, а вырашыў схаваць усё ў закінутай гаспадарчай пабудове.

За крадзеж з пранікненнем у жыллё вяскоўцу пагражае да чатырох гадоў пазбаўлення волі.

## Пагуляла на грошы пенсіянера

**У Гомельскі РАУС з паведамленнем аб крадзяжы грошай звярнуўся 66-гадовы пенсіянер з аграгарадка Улукоўе. Пажылы чалавек паведаміў, што ў яго з шафы знікла 1500 долараў. Ён жа выказаў здагадку, што да гэтага можа быць датычная 39-гадовая жанчына, з якой ён нядаўна пазнаёміўся.**

Аператыўнікі крымінальнага вышуку грамадзянку затрымалі. Як паведамляе УУС Гомельскага аблвыканкама, яна пацвердзіла, што сапраўды ўзяла валюту. У адзін з дзён дзядуля расказаў ёй, што ён цалкам заможны мужчына і мае прыстойныя зберажэнні. Неўзабаве схованка знікла разам з новай знаёмай.

Гамяльчанка за некалькі дзён спусціла грошы пенсіянера. З сябрамі паспела добра пагуляць, пакатацца на таксі, набыла сабе залатыя завушніцы. Іх аператыўнікам удалося канфіскаваць. А вось ад зберажэнняў засталося амаль нічога.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## Да Дня роднай мовы

# «РОДНАЕ СЛОВА» ЯК НАТХНЕННЕ

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар.)*

Пра сёння і заўтра часопіса, а таксама пра тое, як пачуваюцца нашы мова і літаратура, мы гутарым з **галоўным рэдактарам «Роднага слова» Наталляй ШАПРАН.**

***— Ці згодныя вы з тэорыяй, якой прытрымліваўся сярод іншых акадэмік Ліхачоў, што мова валодае ўласнай ментальнасцю, што гэта жывы арганізм?***

— Настолькі згодная са славутым акадэмікам, што ваша пытанне гатовая ўспрыняць як рытарычнае! Так, мова — жывы арганізм, жывей не бывае! Са строга навуковага боку сцвярджэнне нібыта і спрэчнае. Але жывую цеплыню мовы яе носьбіт здольны адчуваць і даносіць і без тэарэтычнага абгрунтавання, калі ён... таленавіты носьбіт. Жывая думка, жывое пачуццё — ці могуць яны рэалізавацца з дапамогай нежывога інструменту, няхай сабе і самага складанага? Асабіста для мяне ўплыў мовы на яе карыстальніка і наадварот — бясспрэчны.

***— Хто асноўная аўдыторыя часопіса? Настаўнікі?***

— Да нас звяртаюцца і навуковец, і аспірант, і студэнт, і бібліятэкар, і кожны ахвотны да новых ведаў, прычым не толькі філалагічнага кірунку. Ну як вызначыць чытача шматлікіх мастацтвазнаўчых і культуралагічных артыкулаў, якія напаўняюць раздзел «Нацыянальная і сусветная культура»? Хіба ж толькі настаўнік захоча, напрыклад, пазнаёміцца з гісторыяй беларускай выцінанкі, «прайсціся» па залах айчынных музеяў, убачыць рэпрадукцыі невядомых раней палотнаў беларускіх мастакоў або «дакрануцца» да таямніц беларускага дойлідства?

**«Мяркуючы па водгуках чытачоў, выпісваць «Роднае слова» — прэстыжна!»**

***— У часопіса павінен быць вялікі наклад...***

— Павінен... Мяркуючы па водгуках чытачоў, выпісваць «Роднае слова» — прэстыжна! Настаўнік-філолаг, які выпісвае часопіс, нібы аўтаматычна набывае «даважку» да свайго прафесійнага багажу, павышае свой аўтарытэт. У краіне больш за тры тысячы навучальных устаноў, дзе выкладаецца беларуская мова, значыць, адных філолагаў яшчэ больш. Але на сёння лічбы не натхняюць — наклад «Роднага слова» значна меншы за тэарэтычна чаканы.

***— Яшчэ ў маладых літаратараў часоў суполкі «Тутэйшыя» ўзнікла палкае жаданне ўводзіць беларускую культуру ў кантэкст сусветнай, супастаўляць на роўных здабыткі замежнай літаратуры і айчыннай. Ці ёсць сёння ў часопісе рубрыкі і матэрыялы адпаведнай скіраванасці?***

— Цікава, што згаданы вамі перыяд у гісторыі новай беларускай



літаратуры супадае з часам заснавання «Роднага слова», а яго канцэпцыя, што застаецца надзённай і сёння, надзвычай сугучная тагачаснаму імкненню маладых інтэлектуалаў разглядаць нашу культуру ў кантэксце сусветнай. Відаць, першы галоўны рэдактар часопіса Міхась Мікалаевіч Шавыркін востра адчуў подых часу і не памыліўся з фарматам выдання. Акрэсленая тады тэматыка «Роднага слова», як я ўжо згадвала, не абмяжоўваецца філалагічнай сферай, звяртаецца да шматлікіх аспектаў сусветнай культуры. Згадваюцца імёны Уладзіміра Мархеля і Міхася Кенькі — пачынальнікаў рубрыкі «Шматгалосае рэха», у якой паказвалася сувязь айчыннай літаратуры з сусветнай праз мастацкія пераклады. У апошнія гады ў часопісе актуалізаваліся рубрыкі «Перазовы», «Зоркі сусветнай літаратуры». Нашы аўтары звярталіся да мастацкай рэцэпцыі сусветнай класікі ў творчасці Багдановіча, даследавалі перакладчыцкую спадчыну беларускіх літаратараў, параўноўвалі Быкава і Гарэцкага з заходнімі творцамі — удзельнікамі сусветных войнаў, аналізавалі апавяданні Брыля і Навуменкі ва ўсходнеславянскай моўнай прасторы, разглядалі беларускі кантэкст спадчыны Івана Буніна. Пералік падобных публікацый можна доўжыць і доўжыць.

***— Праблема статусу беларускай мовы ў грамадстве па-ранейшаму балючая... Хоць, здаецца, пераламалася сітуацыя, калі ўжыванне гэтай мовы было маркерам непісьменнасці, вясковасці. Мова на асфальце прыжылася. Але чуваць на вуліцах і ва ўстановах яе мала. Найчасцей апраўдваюцца тым, што недасканала валодаюць, баяцца памыліцца. На што з'явіўся падбадзёрлівы лозунг «валі трасянкай». Маўляў, галоўнае — не саромецца і пачаць, няхай і з памылкамі. А вы што параіце, як пашырыць ужыванне беларускай мовы ў нашым побыце?***

— Разняволеная трасянкай, мабыць, карыстацца не трэба, гэта можа справакаваць неахайнасць ва ўжытку, павярнуць да тае ж «вясковасці». Але, ведаеце, я заўсёды чамусь любуюся такімі вось спробамі нашых моўных неафітаў, нясмелымі, далікатнымі... Гэта вельмі міла гучыць і выглядае. Выдае шчырую душу, нейкую нашу арганічную беларускую інтэлігентнасць. І сілкуе надзею.

**«Міжнародны дзень роднай мовы быў заснаваны ЮНЕСКА дзеля абароны і захавання моў, якія знаходзяцца пад пагрозай знікнення».**

На жаль, канкрэтных парад наконт хуткага пашырэння мовы ў побыце не маю. Думаю, у такой сферы, як мова, увогуле не варта спадзявацца на нейкія катэгарычныя рухі. Вось вы вельмі дакладна заўважылі: мова на асфальце прыжылася. Менавіта прыжылася, не ўвялася нейкім валявым дзеяннем, не прышчапілася штучна — прыжылася. Як гэта адбылося, чаму? Вядома, будзем мець на ўвазе нястомныя намаганні нашых шчырых рупліўцаў на моўнай ніве. Але вада пайшла б у пясок, калі б у неабыякавых людзей, асабліва ў моладзі, паступова не пачаў прачынацца інстынкт самапавагі, калі б само жыццё не пайшло насустрач. Прынамсі, калі б не пачало высвятляцца, што вось гэтая «вясковая гаворка» незаўважна робіцца ці не элітарнай моваю народа! Магчыма, я тут занадта аптымістычная, але будзем спадзявацца на яго вялікасць Час. Тым больш ён цяпер, як мне падаецца, працуе на нас.

***— Тым не менш праблема распаўсюджаных памылак у карыстанні мовай застаецца — бо яны гучаць з экранаў, са сцэн, у прэсе. Ведаю, вы займаліся гэтым пытаннем... А можаце прывесці для чытачоў «Звязды» колькі такіх замацаваных памылак?***

— Не так бянтэжаць памылкі, як тое, што яны ўпарта не знікаюць. З сумам назіраю, як штогод напярэдадні Дня роднай мовы ў сродках масавай інфармацыі з'яўляюцца матэрыялы з пералікам распаўсюджаных моўных памылак. Часам такія публікацыі маюць ледзь не сатырычнае гучанне, маўляў, вось як смешна выглядаюць такія моўныя хібы. Але ж варта памятаць, што Міжнародны дзень роднай мовы быў заснаваны ЮНЕСКА дзеля абароны і захавання моў, якія знаходзяцца пад пагрозай знікнення. Наша мова не знікае, але мае моцную патрэбу ў беражлівым абыходжанні, найперш у асяроддзі тых, хто прафесійна працуе з беларускім словам. Шкада, што матэрыялы нашых аўтараў, прысвечаныя культуры маўлення, часта застаюцца без увагі прафесійных рэдактараў, карэктараў, дыктараў...

Аўтары «Роднага слова», як правіла, маюць высокую кваліфікацыю, таму да нас рэдка траляюць памылкі, звязаныя з няправільным ужываннем, напрыклад, лічэбнікаў два, дзве, двое, ці дзеясловаў «бераце», «ідзяце», «несяце», ці канчаткаў назоўнікаў мужчынскага або жаночага роду: Сашам, Сашай, Жэнем, Жэняй. На жаль, цвёрда замацавалася па аналогіі з рускай мовай ужыванне формы вышэйшай ступені параўнання лепшы (без параўнання лепшы за каго ці за што) замест правільнай формы найвышэйшай ступені найлепшы: найлепшы ў сваім пакаленні, лепшы за яго. Такое, вядома, выпраўляем. У нашым часопісе цяжка знайсці нязграбны дзеепрыметнік накшталт «навучаючы» (выправім на «навучальны»), «дамінуючы» (заменім на «дамінантны»).

Мы сутыкаемся з больш спецыфічнымі праблемамі, звязанымі з яшчэ неўстаноўленым напісаннем некаторых слоў або са стылістычным рэдагаваннем. Даводзілася звяртацца ў Інстытут мовазнаўства імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі з просьбай падказаць, якую лепш абраць форму: архетыпічны або архетыпавы (навукоўцы схіліліся да другога варыянта) і г. д. Часам праводзім унутраныя нарады, аналізуючы слоўнікавыя варыянты з розных лексікаграфічных крыніц, напрыклад, абіраючы канчатак роднага склону (-а ці -у) для пэўнага слова.

Цікава, як бы чытачы «Звязды» дапрацавалі наступныя сказы з нашага рэдактарскага досведу: «Апаратар здымаў сцяг, які вывешвалі воіны-вызваляльнікі», «Мы заходзілі да яго з нябожчыкам Пятром», «Нам яшчэ далёка да элементарнай дасканаласці». Аднак, паўтаруся, такія яскравыя прыклады — рэдкасць, часта хібы хаваюцца ў тэкставым масіве і звязаныя з асноўнымі лагічнымі законамі рэдагавання: несупярэчлівасці, лагічнасці, дастатковага абгрунтавання.

***— З'яўленне інтэрнэту і шматлікіх гаджэтаў спарадзіла, мусіць, цэлы слоўнік. Але такія словы прыходзяць да нас найперш з рускай ды англійскай моў, і толькі энтузіясты настойліва шукаюць беларускія адпаведнікі слоўцам тыпу «смайлік». Ці з'яўляюцца ў часопісе матэрыялы на такую тэму?***

— Згадваю нашага сталага аўтара, кандыдата філалагічных навук Алеся Каўруса. Ён уважліва слухае радыё ды чытае перыядычныя выданні, занатоўваючы словы, якія яго ўразілі, здзівілі, натхнілі ці засмуцілі, аналізуе дарэчнасць іх утварэння, ужывання. Шчыра раю калегам-рэдактарам і журналістам прыслухацца да ўдумлівых заўваг шаноўнага мовазнаўцы.

Новая сфера камунікацыі цікавая для навукоўцаў, таму ў часопісе перыядычна выходзяць артыкулы, прысвечаныя мове інтэрнэту. Так, напрыклад, кандыдат філалагічных навук Таццяна Бабко даследавала агульнае і спецыфічнае ў беларуска- і рускамоўных інтэрнэт-дыскусіях, аспірант факультэта журналістыкі БДУ Максім Зайцаў разгледзеў эматыконы ў кантэнце сацыяльнай сеткі «Інстаграм» на прыкладзе канала Белтэлерадыёкампаніі.

**«Мова — жывы арганізм, жывей не бывае!»**

***— У гісторыі беларускай літаратуры шмат незаслужана забытых імёнаў і твораў, якія часта выкрэсліваліся адмыслова. Згадаць хоць бы расстралянае пакаленне паэтаў... Вы аддаяце ўвагу выпраўленню гэтай сітуацыі?***

—Ужо не адзін год даўні аўтар «Роднага слова» Віктар Жыбуль, супрацоўнік Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва, публікуе артыкулы, прысвечаныя (не)забытым творцам першай паловы XX стагоддзя. Гэта вельмі кранальныя, жывыя матэрыялы, дзе даецца кароткая (нярэдка толькі такая і захавалася) біяграфія пісьменніка, аналіз яго творчасці ў кантэксце літаратурнага працэсу, некалькі характэрных вершаў для знаёмства. Выйшлі артыкулы пра Алеся Пруднікава, Язэпа Сукалу, Алеся Наўроцкага, Міколу Сурначова, Юльяна Дрэйзіна, Паўлюка Шукайлу. Лёс некаторых герояў публікацый абарваўся ў 1937 годзе, але хтосьці, перажыўшы трагічныя гады, адмовіўся ад паэтычнага слова, згубіўся ў прозе будняў.

***— Што цікавага ў рэдакцыйным партфелі?***

— Сёлета запрашаем наведаць наш «Музейны квартал» — спецыяльны праект, падрыхтаваны сумесна з Дзяржаўным музеем гісторыі беларускай літаратуры; прэзентуем новыя цыклы, напрыклад, знаёмства з калекцыяй забытых аксесуараў Ігара Сурмачэўскага, што выяўляюць адзінную з Еўропай «модную прастору», у якой жылі нашы шляхетныя продкі. Плануем выпуск нумара-альманаха да 130-годдзя Максіма Багдановіча.

**Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.**

# УНІКАЛЬНЫЯ КРЫНІЦЫ

## Пра што раскажуць кітабы?

**Гэтыя манускрыпты ствараліся з XVI стагоддзя татарамі, якія пасяліліся на тэрыторыі Вялікага Княства Літоўскага. Спачатку кітабамі называлі асобны від літаратуры, а пасля згаданым тэрмінам даследчыкі сталі абазначаць наогул усю рукапісную спадчыну татараў Вялікага Княства Літоўскага і іх нашчадкаў.**



Сяліцца на тэрыторыі княства татары пачалі з XIV — XV стагоддзяў. Паступова яны асімляваліся, пераходзілі на мясцовую мову, але пры гэтым стараліся захаваць уласныя традыцыі і рэлігію, а для гэтага перакладалі на звыклую ўжо мову Каран і іншыя кнігі.

А цяпер уявіце тэксты, напісаныя арабскім пісьмом, справа налева, суцэльным радком без падзелу на словы і без вялікіх літар, у якіх дамінуе тагачасная беларуская народна-дыялектная мова.

Якім ашаламляльным адкрыццём для даследчыкаў сталі гэтыя рукапісы! Тым больш што пісьмовых беларускамоўных крыніц XVII і XVIII стагоддзяў захавалася вельмі мала.

Кітабы пісаліся на розных мовах, але беларускай належыць асаблівая роля. Па-першае, менавіта яна стала той моўнай асновай, на якой утварылася такая этнаканфесійная група, як беларускія мусульмане. Па-другое, менавіта дзякуючы даследчыкам беларускай мовы навукоўцы звярнулі ўвагу на рукапісныя крыніцы татараў ВКЛ.

Тут можна згадаць два важныя перыяды — пачатак XX стагоддзя, калі шэраг выдатных вучоных, грамадскіх дзеячаў зрабілі значны ўнёсак у вывучэнне кітабаў. А пачалося ўсё з работы Івана Луцкевіча, які паказаў, што ў гэтых каштоўных пісьмовых крыніцах захаваны адбіткі моўнай сітуацыі XVII і XVIII стагоддзяў, наогул гісторыі мовы. І гэта адкрыццё на той час было сапраўднай бомбай, якая «ўзарвала» навуковую грамадскасць, і даследчыкі кінуліся вывучаць усю тую інфармацыю, што захавалася дзякуючы татарскім манускрыптам. Праўда, неспакойныя 1930-я гады перарвалі гэтыя пачынанні.

Зноў да кітабаў навукоўцы звярнуліся толькі пасля Другой сусветнай вайны, тут ужо — дзякуючы рабоце прафесара Віленскага ўніверсітэта Антона Антановіча. Дарэчы, у акадэмічнай бібліятэцы ёсць кніга з аўтографам гэтага вучонага, якую ён падпісаў для Пятра Глебкі.

Работа Антановіча «Беларускія тэксты арабскім пісьмом», зробленая ў 1968 годзе, натхніла ўжо даследчыкаў з розных краін. З кітабамі разам з беларусамі працуюць іх калегі з Польшчы, Літвы. Да мовазнаўцаў далучаюцца спецыялісты іншых кірункаў — рэлігіязнаўцы, гісторыкі, культуролагі. І кожны знаходзіць сваю падставу для захаплення, бо цікавыя тут не толькі моўныя адзінкі і формы (ствараючы кітабы, татары імкнуліся перадаць тутэйшыя словы з максімальнай дакладнасцю, і цяпер па іх можна вывучаць у тым ліку і фанетычныя асаблівасці старой беларускай мовы). У кітабах адлюстраваны побыт, звычаі, традыцыі татараў-перасяленцаў, таму іх тэксты — каштоўны матэрыял як для лінгвістаў, так і для этнографаў. Акрамя рэлігійных тэкстаў, сустракаецца і шмат побытавых запісаў. Тут можна знайсці ўсходнія легенды і казкі, прыгодніцкія аповесці, апісанні мусульманскіх рытуалаў, павучанні для падрастаючых пакаленняў, замовы, варажбу.

Тут хопіць работы яшчэ не аднаму кітабісту (калі раней гэты тэрмін прыводзілі паўжартам, то сёння ён трапляецца ўжо ў навуковай літаратуры). Так, калі гісторыі татараў раней прысвячаліся работы, то мала хто закранаў іх літаратуру, пісьменства, узаемаадносіны з мясцовай супольнасцю. Цікава, як спалучалася ў гэтых крыніцах шмат моў, пры гэтым розныя мовы маглі выконваць свае асаблівыя функцыі. Так, на арабскай мове, сакральным складніку ісламу, пісаліся цытаты з Карана, а каментарыі да іх (напрыклад, як трэба чытаць тую ці іншую малітву, як зрабіць пэўны рытуал) пісаліся на мове штодзённага ўжытку, якой карысталіся тутэйшыя татары.

Пакуль яшчэ не закрыта пытанне аб колькасці кітабаў. Іван Луцкевіч лічыў, што яму пашчасціла знайсці ці не адзін з апошніх рукапісаў, што захаваліся са старых часоў. Пазней аказалася: такіх крыніц — мора. Кола ведаў пра татарскую пісьмовую спадчыну пашыраецца, каталогі, што апісваюць гэтыя помнікі, выходзяць у Беларусі, Польшчы, Літве.

Нават у XXI стагоддзі беларускія даследчыкі ў экспедыцыях па Беларусі выйшлі на новыя крыніцы. Яны рабілі электронныя копіі рукапісаў, якія захаваліся ў прыватным уладанні татарскіх сем'яў. Такім чынам было зроблена больш за 200 копій рукапісаў. Яны ўвайшлі ў асобны каталог, у дадатак да якога ідзе дыск. У планах — змясціць рукапісы і іх апісанне ў інтэрнэце.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

# ЦЭЛЫ ТОМ ТЛУМАЧАЛЬНАГА СЛОЎНІКА ПРЫСВЕЧАНЫ АДНОЙ ЛІТАРЫ

## Як навукоўцы дапамагаюць мове жыць і развівацца

**Сучасная беларуская літаратурная мова, самабытная і адна з высокаразвітых славянскіх моў, з'яўляецца неад'емным скарбам народа, які выяўляе прыналежнасць чалавека да той ці іншай нацыі, — сцвярджаюць навукоўцы. Галоўная задача, якая сёння стаіць перад імі — зрабіць так, каб наступныя пакаленні маглі карыстацца моўнымі здабыткамі, былі захавальнікамі культурнага кода нашай нацыі.**

### 100-ГОДДЗЕ РАБОЦЕ НАД НОРМАМІ

Пытаннямі станаўлення, развіцця і нармалізацыі літаратурнай мовы займаецца Інстытут мовазнаўства імя Якуба Коласа Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук. Толькі тут ва ўсе часы рыхтаваліся фундаментальныя акадэмічныя працы, якія затым на многія гады станавіліся нарматыўнымі даведнікамі для ўсіх карыстальнікаў літаратурнай мовы на тэрыторыі Беларусі. Не сталі выключэннем і апошнія два дзесяцігоддзі. У гэты час з улікам моўнай практыкі і тых тэндэнцый, якія праявіліся ў сістэме беларускай мовы ў XXI стагоддзі, былі падрыхтаваны манаграфіі, даведнікі, дапаможнікі, якія цяпер забяспечваюць аднастайнасць у выкарыстанні пісьмовай і вуснай мовы. Найперш гэта выданне трохтомнага комплексу граматычных слоўнікаў: «Граматычны слоўнік дзеяслова», «Граматычны слоўнік назоўніка», «Граматычны слоўнік прыметніка, займенніка, лічэбніка і прыслоўя». У гэтым комплексе прадстаўлены поўныя словазмяняльныя і акцэнтуацыйныя парадыгмы больш як ста тысяч слоў сучаснай літаратурнай мовы. Аб'ём гэтага выдання — каля 400 улікова-выдавецкіх аркушаў.

Дарэчы, гэтыя слоўнікі, як і іншыя працы вучоных, разыходзяцца ў кнігарнях як гарачыя піражкі. Усё таму, што яны вельмі зручныя і арыгінальныя ў падачы, могуць быць карысныя для карыстальнікаў з розным узроўнем валодання мовай. Аналагаў такіх работ у славянскім свеце вельмі мала. Наклад арфаэпічнага слоўніка, напрыклад, быў раскуплены менш чым за месяц.

**Валянціна РУСАК, загадчыца аддзела сучаснай беларускай мовы Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа,** заўважае, што актуальныя стандарты моўнага нармавання таксама зафіксаваны і ў «Слоўніку беларускай мовы», і ў апошнім аднатомным выданні «Тлумачальнага слоўніка беларускай літаратурнай мовы», а таксама ў першым поўным лінгвістычным даведніку па літаратурным вымаўленні («Арфаэпічным слоўніку», які падрыхтаваны ў беларускім мовазнаўстве ўпершыню). Яны з'яўляюцца фундаментальнымі даведнікамі, таму што маюць нарматыўную накіраванасць, адлюстроўваюць стан літаратурнай нормы XXI стагоддзя, прыводзяць варыянтныя формы словазмянення, словаўтварэння і вымаўлення.

Стагадовы шлях кадыфікацыі беларускай мовы аргументавана прадстаўлены ў манаграфіі «Дынаміка нормы сучаснай беларускай мовы» . Выхад у свет у 1918 годзе першай кнігі Браніслава Тарашкевіча «Беларуская граматыка» прынята лічыць пачаткам унармавання сучаснай беларускай літаратурнай мовы. На сёння акадэмічнае мовазнаўства рэальна забяспечвае функцыянаванне мовы, захаванне і адзінства арфаграфічных і арфаэпічных норм.

У нашай сацыялінгвістычнай сітуацыі дзяржаўнага двухмоўя неабходна забяспечваць якаснае паралельнае валоданне абедзвюма мовамі, і навукоўцы працуюць у гэтым кірунку. «Русско-белорусский словарь» і «Беларуска-рускі слоўнік» — гэта трохтомныя выданні, якія дапамагаюць дыферэнцыравана і правільна ўжываць залацінкі лексічных багаццяў дзвюх роднасных моў.

Сумесна са славістамі іншых краін ужо больш за 60 гадоў выконваецца ўнікальны праект «Агульнаславянскі лінгвістычны атлас». Ужо змянілася тры пакаленні беларускіх мовазнаўцаў і рыхтуецца чацвёртае, якое будзе працаваць над словам на ўсёй прасторы славянскага свету. Гэты атлас паказвае ступень роднасці ўсіх славянскіх моў і тыя нацыянальныя здабыткі, якія з'явіліся ў пасляславянскі перыяд.

Трэба адзначыць і падрыхтоўку новай акадэмічнай граматыкі, паколькі важна мець не толькі дапаможнікі і слоўнікі, але і канкрэтны практычны матэрыял, тэарэтычныя апісанні, правілы і матэрыялы. Над падрыхтоўкай двух тамоў граматыкі вучоныя акадэміі працавалі разам з вядучымі выкладчыкамі і спецыялістамі з ВНУ: Белдзяржуніверсітэта, педагагічнага і тэхналагічнага ўніверсітэтаў.

Падрыхтаваны першы том доўгачаканага «Тлумачальнага слоўніка беларускай мовы». Уявіце, наколькі шмат моўных сродкаў мы маем, калі цэлы том тлумачальнага слоўніка прысвечаны толькі словам на літару «А».

Выкананы пераклад шасці законаў Грамадзянскага кодэкса Рэспублікі Беларусь. Робіцца спробы папулярызацыі нашай мовы сярод іншых народаў свету, сумесна з Інстытутам Канфуцыя падрыхтаваны «Беларуска-кітайскі перакладны слоўнік».

### СПРАВА ГОНАРУ

Па-ранейшаму актуальная работа з пісьмовымі набыткамі. На жаль, да гэтага часу адсутнічае поўнае лексікаграфічнае даследаванне моўнага багацця спадчыны Якуба Коласа, якое будзе мець несумненна вялікае значэнне для развіцця не толькі беларускай, але і ўсёй славянскай лексікаграфіі. Плануецца выдаць пяць тамоў слоўніка мовы Якуба Коласа. Як заўважыла Валянціна Паўлаўна, гэта справа гонару для Інстытута мовазнаўства, тым больш што ён носіць імя класіка. Сістэматызаваны лексікаграфічны матэрыял праілюструе не толькі майстэрства пісьменніка, але і багацце нацыянальнай мовы. Здабыткі класікаў будуць карысныя для наступных пакаленняў пісьменнікаў, дзякуючы якім людзі вучацца пісаць і адчуваць мову. І гэта яшчэ адзін са шляхоў вяртання, альбо шанц для надання другога «дыхання» нацыянальным здабыткам, якія паспелі занатаваць творцы пачатку XX стагоддзя.

### КАНКУРЭНЦЫЯ НАРАДЖАЕ НОВЫЯ ПАДЫХОДЫ

Як прызнаўся дырэктар Інстытута літаратуразнаўства імя Янкі Купалы Іван Саверчанка, каб напісаць добрую манаграфію, якая потым паслужыць развіццю навукі, адукацыйнай сістэмы, патрабуецца шмат намаганняў і часу — пяць, а можа, і 10 гадоў. Тое ж і з літаратурнымі творамі. Каб напісаць раман, асэнсаваць грамадска-сацыяльную з'яву, нават пры належным таленце, пісьменніку неабходна глыбокае веданне жыццёвых рэалій. Натуральна, аўтары стараюцца пашырыць свае адкрыцці, творчыя і навуковыя, сярод народаў свету. Таму назіраецца добрая тэндэнцыя, калі створаныя ў Беларусі кнігі перакладаюцца на мовы іншых народаў. У той жа час пісьменнікі, якія пішуць па-руску, імкнуцца пашырыць сваю аўдыторыю за кошт тых, хто чытае па-беларуску. Гэта дазваляе ва ўмовах глабалісцкага ціску выстаяць і развівацца. Адпаведна прымушае навукоўцаў і творцаў працаваць над якасцю сваіх работ, бо толькі канкурэнтны, адметны, мастацка-эстэтычны прадукт можа выйсці за нацыянальныя межы і атрымаць падтрымку ў іншых краінах.

З боку дзяржавы створаны належныя ўмовы, каб мастацкае слова і плённа развівалася. Іван Саверчанка падзяліўся: ён адчувае, што расце запыт на тое, каб работа над словам пашыралася, намеціліся трэнды шанавання і пашырэння беларускай мовы.

Шмат намаганняў трэба і для таго, каб усё, што ствараецца ў галіне беларускай літаратуры, станавілася набыткамі моладзі і грамадства ў цэлым. Для гэтага прымаюцца пэўныя захады, напрыклад, праводзяцца нацыянальныя літаратурныя конкурсы, наладжана сістэма работы з бібліятэкамі. З іншага боку, усплываюць і праблемы. Так, скарачаецца колькасць бібліятэк. Таму сёння трэба шукаць новыя формы і метады работы, думаць пра мадэрнізацыю тых жа бібліятэк (напрыклад, яны маглі б стаць шматфункцыянальнымі інфармацыйнымі цэнтрамі). Работу па пашырэнні ведаў пра моўныя і літаратурныя здабыткі ніколі нельга спыняць. Менавіта яна — найлепшая «прышчэпка» для таго, каб наступныя пакаленні не ператварыліся ў выключна спажыўцоў, а дбалі пра культурнае развіццё грамадства.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

## Дукорский сельский исполнительный комитет Пуховичского района Минской области 23 марта 2021 года в 15.00 в здании Дукорского сельского исполнительного комитета, расположенного по адресу: аг. Дукора, ул. Речная, д. 14 Пуховичского района Минской области проводит открытый аукцион по продаже гражданам Республики Беларусь земельных участков для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов

| Адрес земельного участка, кадастровый номер | Площадь земельного участка (га) | Наличие инженерных сетей | Наличие ограничений | Расходы по подготовке документации (рублей) | Начальная цена (рублей) | Задаток (рублей) |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Лот № 1 аг. Дукора, ул. Школьная, 30А, 624483402101001672 | 0,1193 | Сети электроснабжения, газоснабжения | Охранная зона электрических сетей напряжением до 1000 вольт | 1733,38 + расходы за объявление в СМИ | 4853,12 | 485,31 |
| Лот № 2 д. Подлипки, 11, 624483405101000100 | 0,1419 | Сети газоснабжения | Охранная зона объектов газораспределительной системы площадью 0,0101 га | 1571,14 + расходы за объявление в СМИ | 4798,06 | 479,81 |
| Лот № 3 аг. Дричин, ул. Парковая, 10, 624483402001000323 | 0,1500 | Сети электроснабжения, газоснабжения, водоснабжения | Охранная зона электрических сетей напряжением до 1000 вольт | 1638,03 + расходы за объявление в СМИ | 4597,13 | 459,71 |

Желающим участвовать в аукционе необходимо внести соответствующий размер задатка на р/с BY23AKBB36006250900060000000, УНП 600537220 , код платежа 04901 (частная собственность).

Получатель: главное управление Министерства финансов Республики Беларусь по Минской области.

Банк: ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, BIC AKBB BY2X.

**Участники аукциона должны предоставить следующие документы:**

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме.
2. Копии платежных поручений, заверенных банком, подтверждающие внесение задатка на расчетный счет продавца.
3. Физическим лицам – документ, удостоверяющий личность (паспорт) покупателя, или его доверенного лица и доверенность, заверенную нотариально в случае если интересы покупателя представляет это лицо).
4. Заключить соглашение с местным исполнительным комитетом.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются до **17.00 17 марта 2021 года по вышеуказанному адресу.**

Аукцион состоится по каждому лоту при наличии не менее двух участников.

Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на предоставление предмета аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан:

в течение 10 (десяти) рабочих дней после утверждения протокола о результатах аукциона осуществить оплату земельного участка и расходы по организации и проведению аукциона, затраты на публикацию информационного сообщения;

в течение двух месяцев со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся обратиться за государственной регистрацией права частной собственности на земельный участок;

получить в установленном порядке разрешение на проведение проектно-изыскательских работ, разработать и утвердить строительный проект на строительство жилого дома в срок, не превышающий два года.

Участники аукциона предварительно могут ознакомиться с земельными участками, выставленными на аукцион, путем выезда на место нахождения участка.

Затраты на строительство, в том числе проектирование объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры к земельным участкам для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов, **подлежат возмещению** в порядке, предусмотренном в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 7 февраля 2006 г № 72 «О мерах по государственному регулированию отношений при размещении и организации строительства жилых домов, объектов инженерной, транспортной и социальной инфраструктуры».

Контактные телефоны: (801713) 63935, 99436, 99322.

Сайт Пуховичского райисполкома.

УНП 600177864

## ОАО «АМКОДОР» – управляющая компания холдинга» 220013, г. Минск, ул. П. Бровки, 8, комн. 201. Извещение о проведении очередного (годового) общего собрания акционеров общества

Собрание состоится 30 марта 2021 г. в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. П. Бровки, 8, актовый зал общества.

Орган, созывающий собрание акционеров, – Совет директоров ОАО «АМКОДОР» – управляющая компания холдинга».

Регистрация участников собрания производится в день и по месту проведения собрания с 13.30 до 14.45.

Регистрация лиц, имеющих право на участие в собрании, осуществляется при предъявлении ими документов, подтверждающих их личность и полномочия. При регистрации акционеры предъявляют документ, удостоверяющий личность; представители акционеров предъявляют документ, удостоверяющий личность, и подтверждают свои полномочия надлежащим образом оформленной доверенностью (договором) (руководители юридических лиц – акционеров – документом, подтверждающим статус руководителя).

**Повестка дня**

1. Отчет генерального директора об итогах финансово-хозяйственной деятельности общества за 2020 год. Утверждение ключевых показателей эффективности на 2021 год.
2. Утверждение годового отчета, годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности общества за 2020 год.
3. Об утверждении распределения и использования прибыли (убытков) за 2020 год.
4. Утверждение направлений распределения прибыли общества на 2021 год.
5. Об избрании членов Совета директоров, его составе и Ревизионной комиссии общества.
6. Утверждение размера вознаграждения членам Совета директоров и Ревизионной комиссии общества.

Лица, имеющие право на участие в собрании, имеют право ознакомиться с информацией о деятельности общества за отчетный период, начиная с 10 марта 2021 года, а с иной информацией (документами), подлежащими представлению при подготовке к проведению собрания, начиная с 23 марта 2021 года ежедневно (кроме субботы и воскресенья) в юридическом управлении ОАО «АМКОДОР» – управляющая компания холдинга» (220013, г. Минск, ул. П. Бровки, 8) с 9.00 до 16.00, а в день проведения собрания – по месту его проведения.

**Совет директоров**
**ОАО «АМКОДОР» – управляющая компания холдинга».**

УНП 100135676

## Дукорский сельский исполнительный комитет производит (повторно) продажу одноквартирных жилых домов согласно Указу Президента Республики Беларусь от 04.09.2018 г. № 357 «О пустующих и ветхих домах»

| №п\п | Наименование | Адрес | Цена продажи бел. рублей |
|---|---|---|---|
| 1 | Объект недвижимости: капитальное строение (жилой дом) на земельном участке | Республика Беларусь, Минская область, Пуховичский район, Дукорский с/с, аг. Дричин, ул. Центральная, д. 56 | 10 424,81 бел. руб. (десять тысяч четыреста двадцать четыре белорусских рубля 81 копейка) |
| 2 | Объект недвижимости: капитальное строение (жилой дом) на земельном участке | Республика Беларусь, Минская область, Пуховичский район, Дукорский с/с, д. Белое, д. 17 | 5 314,61 бел. руб. (пять тысяч триста четырнадцать белорусских рубля 61 копейка) |

Продажа проводится без проведения аукциона в случае поступления по истечении тридцати календарных дней со дня опубликования информации заявления на приобретение пустующего дома со стороны одного лица. С ним заключается договор купли продажи жилого дома. Заявления принимаются по 20 марта 2021 года по адресу: 222840, ул. Речная, 14, аг. Дукора Пуховичского района Минской области.

Телефоны для справок: (8-01713) 63935, 99-436.

Эл/почта : dukorselisp@tut.by, dukorselisp@pukhovichi.gov.by

При наличии нескольких претендентов на приобретение пустующего дома его отчуждение будет осуществляться по результатам аукциона.

УНП 600177864

## ОАО «Лидапищеконцентраты» сообщает, что 25 марта 2021 года в 11.00 состоится годовое общее собрание акционеров

**Место нахождения общества: г. Лида, ул. Тавлая, 11**

**Место проведения собрания: помещение актового зала, расположенного по адресу: г. Лида, ул. Тавлая, 11**

ПОВЕСТКА ДНЯ

1. Об итогах финансово -хозяйственной деятельности ОАО «Лидапищеконцентраты» в 2020 году и основных направлениях деятельности Общества на 2021 год.
2. Отчет наблюдательного совета ОАО «Лидапищеконцентраты» за 2020 год.
3. Отчет ревизионной комиссии о результатах проведенной ревизии за 2020 год и заключение по бухгалтерскому балансу, отчету прибылей и убытков, годовому отчету ОАО «Лидапищеконцентраты». Ознакомление Общества с заключением аудитора.
4. Утверждение годового отчета, годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности Общества за 2020 год.
5. Утверждение распределения чистой прибыли за 2020 год. О выплате дивидендов за 2020 год.
6. О направлениях использования чистой прибыли ОАО «Лидапищеконцентраты» на 2021 год.
7. Избрание членов наблюдательного совета ОАО «Лидапищеконцентраты».
8. Избрание членов ревизионной комиссии ОАО «Лидапищеконцентраты».
9. О назначении материального вознаграждения членам наблюдательного совета и ревизионной комиссии.

Акционеры (их представители) имеют право ознакомиться с информацией (документами), подлежащей предоставлению при подготовке к проведению собрания в рабочие дни с 5 марта 2021 года по 24 марта 2021 года с 8.00 до 17.00 по адресу: г. Лида, ул. Тавлая, 11 (приемная секретаря руководителя), а в день проведения Собрания – во время и в месте его проведения.

Регистрация участников собрания с 10.30 до 10.50 по месту проведения собрания.

Для регистрации при себе иметь следующие документы: акционеру Общества – паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность.

**Наблюдательный совет.**

УНП 500021268

## ЗАО «Белреализация» объявляет аукцион

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, **WWW.BELTORGI.BY**

Продавец: ОАО «Рапс» (УНП 600068480) Минский р-н, аг. Крупица, ул. Садовая, 20, тел. 8017 506-91-51.

Повторные публичные торги в электронной форме будут проведены **10 марта 2021 г. с 09.00 до 17.00** на электронной торговой площадке **BELTORGI.BY.**

| № п/п | Предмет торгов | Начальная цена предмета торгов, бел. руб. с НДС |
|---|---|---|
| 1 | Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилища (зернохранилище) с инвентарным номером 600/С-124842, площадью 1 474,7 кв. м, расположенное по адресу: Республика Беларусь, Минская область, Минский район, Крупицкий с/с, район деревни Пятевщина. Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилища (зернохранилище) с инвентарным номером 600/С-124843, площадью 612,0 кв. м, расположенное по адресу: Республика Беларусь, Минская область, Минский район, Крупицкий с/с, район деревни Пятевщина | 173 220,00 |
| 2 | Здание специализированное животноводства (здание коровника) с инвентарным номером 600/С-121229 площадью 1 788,0 кв. м, расположенное по адресу: 223014, Республика Беларусь, Минская область, Минский район, Крупицкий с/с, 12, район д. Дедовка | 104 936,04 |
| 3 | Здание специализированное автомобильного транспорта (здание автогаража с бетонной площадкой и ограждением) с инвентарным номером 600/С-121223, площадью 774,3 кв. м, расположенное по адресу: 223014, Минская область, Минский район, Крупицкий с/с, 7, район д. Аннополь. Здание нежилое (здание пропускного пункта) с инвентарным номером 600/С-121220, площадью 21,7 кв. м, расположенное по адресу: Республика Беларусь, Минская область, Минский район, Крупицкий с/с, район деревни Аннополь | 237 585,84 |

Местонахождение комбайнов – Минский р-н, аг. Крупица, мехдвор ОАО «Рапс». Тел. для ознакомления и осмотра +37529 785-81-56.

**Для участия в торгах необходимо в срок** с 22.02.2021 г. с 09.00 по 09.03.2021 г. до 17.00: 1) зарегистрироваться и подать заявку на участие в торгах по выбранному лоту на сайте **BELTORGI.BY**; 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, оплатить аукционный сбор. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 10 рабочих дней со дня проведения торгов. Срок оплаты предмета торгов – возможна рассрочка платежа на 3 года. Извещение о ранее проведенных торгах было опубликовано в газете «Звязда» от 27.01.2021 г.

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении аукциона

ЛОТ 1:

- капитальное строение, инв. № 420/С-4047 (назначение – здание специализированное животноводства, наименование – здание свинарника-откормочника), общей площадью 1422,5 кв. м, расположенное по адресу: Лидский р-н, Круповский с/с, д. Крупово;
- капитальное строение, инв. № 420/С-4049 (назначение – здание специализированное животноводства, наименование – здание свинарника-маточника), общей площадью 1072,5 кв. м, расположенное по адресу: Лидский р-н, Круповский с/с, д. Крупово;
- капитальное строение, инв. № 420/С-4048 (назначение – здание специализированное животноводства, наименование – здание склада-гумна для кормов с кормокухней и кормоцехом), общей площадью 616,4 кв. м, расположенное по адресу: Лидский р-н, Круповский с/с, д. Крупово;
- капитальное строение, инв. № 420/С-75552 (назначение – сооружение специализированное водохозяйственного назначения, наименование – артезианская скважина № 24041/72), общей площадью 0,0 кв. м, расположенное по адресу: Лидский р-н, Круповский с/с, 13А, в р-не аг. Крупово.

Лот № 1 расположен на земельных участках:

- кадастровый № 423684300055000004, площадью 2,4628 га (назначение – для обслуживания свинофермы), расположенном по адресу: Лидский р-н, Круповский с/с, в р-не аг. Крупово. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земли, находящиеся в прибрежных полосах водных объектов, код – 1; земли, находящиеся в охранных зонах линий электропередачи, код – 6; земли, находящиеся в охранных зонах линий электропередачи, код – 6;
- кадастровый № 423684300055000005, площадью 0,3597 га (назначение – для обслуживания артезианской скважины), расположенном по адресу: Лидский р-н, Круповский с/с, в р-не аг. Крупово. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земли, находящиеся в прибрежных полосах водных объектов, код – 1; земли, находящиеся в зонах санитарной охраны поверхностных и подземных источников водоснабжения хозяйственно-питьевого назначения, код – 3

Начальная цена продажи – 198 720 р. (сто девяносто восемь тысяч семьсот двадцать рублей) с учетом НДС. Сумма задатка – 19 872 руб. (девятнадцать тысяч восемьсот семьдесят два рубля)

Продавец – ОАО «Лида-агротехсервис», 231300, г. Лида, ул. Фурманова, 17, тел. 8-0154-61-14-39

Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 55-87-70

Условия аукциона – без условий. Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

**Аукцион состоится 22 марта 2021 г. в 11.00 по адресу: Гродненская обл., г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209**

Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона http://grino.by/aukcion

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Последний день приема заявлений – 18 марта 2021 г. до 15.00**

*Телефон для справок: 55-87-71 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки». Дополнительная информация http://grino.by*

# ПЯТЫ ТРЫЛЬЁННІК

## Куды рушыць сусветны рынак крыптавалют?



**Неверагоднае нарэшце здарылася — днямі курс біткоіна пратэсціраваў гістарычную адзнаку $50 тысяч. Толькі на працягу лютага галоўная крыптавалюта падаражэла больш чым у 1,5 раза. «Біток» зноў у цэнтры ўсеагульнай увагі. Ён вярнуўся да неймавернага росту і пабіў гэтай зімой усе мінулыя рэкорды, цалкам акрыяўшы ад аглушальнага падзення двухгадовай даўнасці. З пачатку года курс «крыпты» неаднойчы абнавіў гістарычны максімум. На хвалі такога імклівага ўзлёту свет зноў пільна адсочвае рынак крыптавалют і строіць у яго дачыненні звышаптымістычныя прагнозы, заўважыла lenta.ru. Тым не менш, папярэджваюць эксперты, радавацца пакуль заўчасна. Куды ж рушыць сусветны рынак крыптавалют?**

### ФЕРМЫ І ПУЛЫ

2010-я ўвойдуць у гісторыю як дзесяцігоддзе, калі крыптавалюты пачалі змяняць спосабы пакупкі і продажу. Біткоін — унікальны грашовы актыў, паколькі ён вольны ад кантролю з боку цэнтрабанкаў і не мае патрэбы ў аўдыце трэціми асобамі для пацвярджэння яго кошту. Замест гэтага яго пастаянна адсочваюць і верыфікуюць тысячы камп'ютараў, падключаных да агульнай сеткі — блокчэйна, дзе для дасягнення кансэнсусу выкарыстоўваецца крыптаграфія. Тэхналогія размеркаваных рэестраў, якая ляжыць у аснове блокчэйна, патэнцыйна можа змяніць не толькі свет фінансаў, але і такія рэчы, як валоданне нерухомасцю, ахова здароўя і галасаванне, адзначыў Forbes.ru.

У пачатку дзесяцігоддзя толькі лічаныя спецыялісты ведалі пра біткоін, які быў створаны 3 студзеня 2009-га таямнічым распрацоўшчыкам, вядомым пад імем Сатошы Накамота. У генезіс-блоку блокчэйна ён закадзіраваў напамін пра тое, што бывае, калі банкам празмерна давяраюць. Гэта быў загаловак з брытанскай газеты, дзе гаварылася аб будучай дапамозе брытанскага ўрада фінансавым установам пасля іх краху ў 2008 і 2009 гадах: «The Times» 3 студзеня 2009 года, канцлер казначэйства збіраецца другі раз выратаваць банкі».

У той дзень быў здабыты блок біткоіна пад нумарам 32620, які прынёс майнеру 50 віртуальных манет. Тады долар быў роўны 1300 «біткам». Накамота заклаў у сістэму абмежаванне: усяго атрымаць можна толькі 21 мільён біткоінаў, таму па меры росту папулярнасці крыптавалюты для яе здабычы патрабавалася ўсё больш магутнасці. Для іх павелічэння да дамашніх камп'ютараў спачатку падключалі гульнявыя відэакарты, затым з'явіліся майнінгавыя фермы — магутныя камп'ютары, сабраныя з некалькіх відэакартаў, мацярынскай платы і блока сілкавання. У сярэдзіне 2010-х разам з відэакартамі з'явіліся «асікі» (ад англ. ASIC, application-specific integrated circuit — інтэгральная схема спецыяльнага прызначэння) — яшчэ больш магутнае абсталяванне, створанае спецыяльна для майнінгу. Каб больш эфектыўна вырашаць матэматычныя задачы, майнеры пачалі ствараць пулы — каманды, якія аб'ядноўваюць магутнасці свайго абсталявання, а затым дзеляць здабытае ўзнагароджанне прапарцыянальна прадукцыйнасці.

На шляху да сусветнага панавання крыптавалюта неаднойчы сутыкалася і з перашкодамі. Распаўсюджванне тэхналогіі суправаджалі скандалы: напрыклад, у 2013 годзе ФБР ліквідавала нелегальную анлайн-біржу наркотыкаў і кантрабандных тавараў, на якой усе здзелкі праходзілі ў біткоінах, а ў 2014-м хакеры ўкралі $450 млн з крыптабіржы Mt.Gox. Напрыканцы 2017-га ўзнік глабальны ажыятаж вакол спекуляцый з «крыптай», што спарадзіла тысячы бескарысных токенаў і прычыніла інвестарам страты на мільярды долараў.

### МАГУТНАЕ РАЛІ

У гісторыі біткоіна было некалькі цыклаў нястрымнага росту і наступнага магутнага падзення. У пачатку 2009 года New Liberty Standard устанавіў курс галоўнай крыптавалюты на ўзроўні каля 0,00076 долара. Аднак ужо ўлетку яе кошт быў амаль у сто разоў вышэйшы, а да сярэдзіны восені за адзін «біток» давалі 50 цэнтаў. Да лістапада 2013-га курс дасягнуў 1,2 тысячы долараў. Такім чынам, манета падаражэла ў 1 570 800 разоў усяго за чатыры гады!



У 2014—2015 гадах рынак крыптавалют захапілі «мядзведзі» (інвестары, якія іграюць на паніжэнне цаны), і курс біткоіна не перавышаў увесь гэты час 300 долараў. Сярод прычын такога магутнага падзення — банкруцтва біржы Mt.Gox, на якой тады гандлявалася 90 працэнтаў усіх «біткоў». Гэта прывяло да сапраўднай панікі на рынку і зніжэння цаны лічбавай валюты. Сітуацыя ўскладнялася тым, што тады біткоінамі цікавіліся ў асноўным «гікі» (людзі, захопленыя высокімі тэхналогіямі).

У снежні 2014 года адбылася знакавая падзея — карпарацыя Microsoft услед за анлайн-рытэйлерам Overstock пачала прымаць плацяжы ў біткоінах за гульні для Xbox, у ліпені 2015-га з'явілася новая крыптавалюта Ethereum («эфір») коштам у $3 за коін (за адзін біткоін тады давалі каля $280), а да сакавіка 2016-га кошт «эфіру» дасягнуў $15.

Восенню 2015-га галоўная «крыпта» ўзяла новы разгон і за пару гадоў шматкроць абнавіла свае максімумы і прыцягнула цікавасць буйных інвестараў. Увесь 2017 год прайшоў пад эгідай магутнага ралі — біткоін прайшоў шлях ад 1274 долараў да $20 тыс. за дзевяць месяцаў. Крыптавалюты сталі надзвычай папулярнай тэмай, СМІ пільна адсочвалі кожны рух «бітка», а простыя абывацелі кінуліся яго купляць. На гэтым фоне новыя лічбавыя валюты раслі як грыбы пасля дажджу. Аб планах стварыць уласныя манеты абвясцілі «УКантакце» і «Facebook».

Але на змену росту ізноў прыйшло падзенне. За 2018 год біткоін планамерна прабіваў адзнакі ў 17, 15, 12, 10, 8, 6 і 4 тысячы долараў. У выніку гадавы мінімум склаў $3242. Такім чынам «біток» страціў больш чым на 80 працэнтаў. Следам за флагманам уніз скіраваліся



і іншыя крыптавалюты (альткоіны), а сукупная капіталізацыя рынку страціла амаль 90 працэнтаў — на ўзроўні каля 130 мільярдаў долараў яна апошні раз знаходзілася ў жніўні 2017-га.

Абодва разы біткоін праходзіў класічны цыкл, калі абывацелі, узбуджаныя імклівым ростам крыптавалюты, упадалі ў стан эйфарыі і разганялі рынак да стану бурбалкі. Пасля гэтага бурбалка лопалася пад уздзеяннем знешніх фактараў, і біткоін, а за ім і астатнія, падаў значна ніжэй раўнаважкіх значэнняў. Абвал цаны адпужваў дылетантаў і спекулянтаў, адначасова прыцягваючы ў галіну банкі і буйныя фонды, якія зацікаўлены ў інвеставанні ў крыптавалюту ў сярэднетэрміновай перспектыве.

### $500 ТЫСЯЧ ЗА МАНЕТУ

У 2019 годзе «крыпце» ўдалося адыграць толькі нязначную частку падзення, але аб колішнім росце гаворкі ўжо не ішло. Цікавасць грамадскасці да гэтага рынку ўсё больш згасала. Але ў 2020-м усё змянілася. Кошт крыптавалюты пачаў расці ў сакавіку мінулага года на фоне распаўсюджвання каранавіруса. У наступныя месяцы каціроўкі павялічваліся, пры гэтым буйных абвалаў не было.

Пандэмія прывяла да эканамічнага спаду па ўсім свеце. Каб стрымаць распаўсюджванне віруса, дзяржавы ўвялі розныя меры, якія абмяжоўваюць рух людзей. Гэта прывяло да спаду попыту на нафтапрадукты і сыравіну. Каціроўкі нафты абваліліся. Абмежавальныя меры прывялі і да запаволення дзелавой актыўнасці ў розных сектарах, у першую чаргу — у сектары турызму, гасцінічным і рэстаранным бізнесе. У ЗША і ЕС улады вырашылі стымуляваць эканоміку з дапамогай дадатковых выдаткаў. Многія інвестары асцерагаліся, што гэтыя меры прывядуць да аслаблення традыцыйных валют. На фоне гэтых падзей выраслі інвестыцыі ў крыптавалюты, нагадала Бі-бі-сі.

Яшчэ летась у маі мільярдэр, адзін з самых вядомых сусветных трэйдараў Пол Цюдор Джонс паведаміў, што ён перавёў у біткоін амаль 2 працэнты свайго партфеля. Ён растлумачыў сваё рашэнне тым, што ўлады марнуюць больш, чым дзяржава зарабляе, і ў выніку палітыкі стымулявання ў эканоміку запампоўваюцца дадатковыя грошы. Гэта прыводзіць да абясцэньвання традыцыйных валют, таму інвеставаць у іх няма сэнсу, заўважыў інвестар. Пры гэтым Джонс прызнаў, што інвестыцыі ў біткоін даволі рызыкоўныя, таму што гэта вельмі маладая валюта, якой усяго 12 гадоў. Біткоін яшчэ не вытрымаў выпрабавання часам, як золата, таму ён інвеставаў у біткоіны толькі невялікую частку партфеля, патлумачыў Джонс.

Скептыкі таксама нагадваюць, што рынак крыптавалют усё яшчэ нізкаліквідны: значная колькасць біткоінаў сканцэнтравана ў руках невялікай колькасці інвестараў. Паводле звестак кансалтынгавай кампаніі Flipside Crypto, каля 2 працэнтаў ананімных акаўнтаў валодаюць 95 % усіх біткоінаў. У такіх умовах адна буйная здзелка можа прывесці да моцных ваганняў каціровак.

Інвестар Тайлер Уінклвас — адзін з братоў Уінклвас, вядомых прыхільнікаў крыптавалют — спрагназаваў рост кошту біткоіна да 500 тысяч долараў. У сваім артыкуле ён раскрытыкаваў палітыку стымулявання і адзначыў, што лічыць «біток» добрым актывам для інвестараў, якія хочуць застрахаваць свае ўкладанні ад інфляцыі на доўгі тэрмін.

Біткоін актыўна рос на працягу амаль усяго мінулага года і пацягнуў за сабой уверх іншыя крыптавалюты. Па меры таго, як свет захоплівала пандэмія, гэты рост толькі ўзмацняўся, а да канца 2020-га самая вядомая крыптавалюта ўвогуле пабіла ўсе магчымыя рэкорды. Калі ў пачатку кастрычніка біткоін каштаваў каля 11 тысяч долараў, то 1 снежня курс дасягнуў ужо 19,9 тысячы долараў. 3 студзеня ўпершыню ў гісторыі цана перавысіла 34 тысячы долараў за «біток», а 15 лютага курс пратэсціраваў узровень $50 тысяч.

### ЧАСТКА МЭЙНСТРЫМУ

Кампанія Tesla паведаміла, што інвеставала 1,5 мільярда долараў у біткоіны. Акрамя таго, яна заўважыла, што плануе ў найбліжэйшай будучыні пачаць прымаць «крыпту» як плату за свае прадукты. Найстарэйшы амерыканскі банк Bank of New York Mellon абвясціў, што працуе над стварэннем платформы, якая забяспечыць захоўванне адначасова і звычайных, і лічбавых актываў, а таксама кіраванне імі. Mastercard паведаміла, што пачне непасрэдна працаваць з некаторымі крыптавалютамі. Пры гэтым кампанія вырашыла абмежавацца стэйблкоінамі — крыптавалютамі, якія забяспечаны рэальнымі актывамі. «Аб'явы, зробленыя Mastercard і BNY Mellon, сведчаць аб фундаментальным зруху», — заўважыў Bloomberg старшы рыначны аналітык Oanda Эд Моя. Ён назваў тое, што адбываецца, «выдатнымі навінамі з пункту гледжання далейшага мэйнстрымнага прызнання крыптавалют». Пра тое, што «лічбавыя актывы становяцца часткай мэйнстрыму», The Wall Street Journal таксама заявіў топ-менеджар BNY Mellon Раман Рэгельман.

Аналітыкі Bloomberg раней прадказвалі першай крыптавалюце сёлета ваганні ў дыяпазоне 10—50 тысяч долараў, што на піку дапускае капіталізацыю за 1 трлн долараў, пракаментаваў expert.ru даныя пра дынаміку шэф аналітыкаў Вышэйшай школы кіравання фінансамі Міхаіл Коган. Такой капіталізацыяй сёння могуць пахваліцца толькі чатыры кампаніі, якія гандлююць на Уол-стрыт, адзначыў эксперт. Чацвёртай амерыканскай кампаніяй, якая пераадолела трыльённы парог, услед за Apple, Microsoft і Amazon летась стала Alphabet.

У якасці выратавання ад зніжэння пакупніцкай здольнасці фіятных грошай інвестары шукаюць прыстанішча ў золаце, кажа эксперт, і сярод іх набірае ўсё большую папулярнасць ідэя размяшчэння капіталу ў яго лічбавым аналагу, біткоіне. Некаторыя эксперты паступова рухаюцца ад скепсісу ў адносінах да першай крыптавалюты да разумення, што на іх вачах заражджаецца новы клас актываў, у які рынуліся інстытуцыйныя інвестары і публічныя кампаніі, якія пачалі размяшчаць у біткоіне свае рэзервы, адзначыў expert.ru.

Варта памятаць, папярэдзіў Міхаіл Коган, што «крыпта» застаецца рызыкоўным актывам і яе ваганні па-ранейшаму ў разы перавышаюць паказчыкі таго ж золата. Нават ва ўмовах захавання фундаментальных прычын для росту біткоін будзе схільны да істотнай карэкцыі.

**Захар БУРАК.**

# КЛЮШКА ДА КЛЮШКІ

## «Сямейнае» шчасце хакея на траве

**Хто хоча дзейнічаць, той шукае магчымасці, хто не хоча — шукае прычыны, вучыў матывацыі старажытнагрэчаскі філосаф Сакрат. Добра гэта засвоіў... хакей на траве, які няўпынна развіваецца і набывае папулярнасць ва ўсім свеце. Для таго каб паспяхова працаваць, прыйшлося нават стварыць новы від спорту — індорхакей, ці ў перакладзе з англійскай мовы «хакей у памяшканні». Алё ён даўно перастаў быць «малодшым братам» хакея на траве, а стаў самастойнай захаплялльнай гульнёй са сваімі турнірамі, аматарамі і сусветным прызнаннем. Праўда, у адрозненне ад хакея на траве, не ўваходзіць у праграму Алімпійскіх гульняў. Але гэта не робіць яго менш цікавым і вартым увагі.**



Акрамя відавочнага адрознення месцам правядзення, хакей у памяшканні ад хакея на траве адрозніваецца і пэўнымі нюансамі ў правілах, і падабенствам да розных гульняў. Пляцоўка для індорхакея адпавядае пляцоўцы для гандбола — 20 на 40 метраў. У кожнай камандзе — па шэсць чалавек, як у валейболе. Матч працягваецца чатыры таймы па дзесяць хвілін, як у міні-футболе. У хакеі на траве адзінаццаць чалавек у кожнай камандзе гуляюць два таймы па 35 хвілін на полі памерам 91 на 55 метраў. Клюшкі і мячы падобныя, але ў індорхакеі яны лягчэйшыя.

### Моцныя клубы — моцная зборная



У Беларусі хакей на траве і індорхакей развіваюцца з 1978 года. За 42 гады зроблена немала, а яшчэ больш чакае наперадзе, упэўнены **старшыня Беларускай федэрацыі хакея на траве Аляксандр ЯКІМЕНКА:** «Мала хто ведае, што ў 1999 годзе наша жаночая зборная па індорхакеі да 21 года была чэмпіёнам Еўропы. Гэта, канешне, не самае гучнае дасягненне, але для нас важнае. Хакейны клуб «Мінск» — бронзавы прызёр Кубка клубных камандаў Еўропы ў 2020 годзе. Гродзенскі «Рытм» добра выступае ў індорхакеі. У краіне пакуль няма належных умоў, спецыялізаваных залаў для заняткаў менавіта індорхакеем. Клубы самі шукаюць рашэнне, рыхтуюцца ў звычайных спартыўных залах. І многія калегі часам здзіўляюцца, як у такіх умовах можна так выдатна рыхтавацца да выступлення на міжнародных турнірах. Ад гэтага нашы поспехі яшчэ больш значныя».

Аляксандр Якіменка нагадвае галоўны прынцып камандных відаў спорту: моцныя клубы — моцная зборная. Гэты пастулат не словам, а справай у 2020 годзе пацвердзіла нацыянальная жаночая зборная па індорхакеі. Упершыню ў айчыннай гісторыі гульнявых відаў спорту беларуская каманда выйграла чэмпіянат Еўропы. «Дзяўчаты абыгралі немак, якія 15 разоў станавіліся чэмпіёнкамі. Нашы спартсменкі перамаглі галандак, а ў Нідэрландах хакей на траве — нацыянальны від спорту, там 310 тысяч чалавек займаецца. Тая перамога стала грандыёзным поспехам усяго беларускага хакея. Зразумела, што такі поспех склаўся не за адзін дзень, гэта вынік шматгадовай каманднай працы спартсменаў, трэнераў, федэрацыі», — адзначае Аляксандр Якіменка.

Па словах кіраўніка беларускага хакея на траве, цяпер галоўная задача — захаваць і памножыць ужо дасягнутыя вынікі і павялічыць колькасць спартсменаў: «Калі 10 гадоў таму мы з шасці школ не маглі набраць 10 дзяцей аднаго ўзросту, то цяпер у нас ужо ёсць канкурэнцыя і адбор. Напрыклад, у хакеі 5 на 5, у адносна новай дысцыпліне, у кожнай узроставай катэгорыі ёсць з каго выбіраць. А вынік з'яўляецца толькі, калі ёсць канкурэнцыя. Нашы трэнеры пастаянна вучацца і павышаюць сваю кваліфікацыю. Мы шмат увагі ўдзяляем навуковаму падыходу. Я нядаўна быў на курсах, дзе абмяркоўвалі новыя падыходы да арганізацыі трэніровачнага працэсу. І даведаўся, што цяпер папулярнасць набывае гендарная інжынерыя. Згодна з гэтай методыкай, групы падбіраюць не па ўзросце спартсменаў, а па сіле, вынослівасці, іншых характарыстыках арганізма. А самае цікавае, што гадоў 20 таму мы ўжо такое практыкавалі. Нашы беларускія дзяўчаты трэніраваліся з хлопцамі, якія, зразумела, мацнейшыя за іх. Дзякуючы гэтай рацыянальнай методыцы падрыхтоўкі дзяўчаты і выйшлі ў пераможцы».

### Паступова, крок за крокам

Глабальная мэта, вядома, выступленне беларускай зборнай на Алімпійскіх гульнях. І «неалімпійскі» індорхакей адыгрывае ў яе дасягненні значную ролю. Як мінімум, ён не дае гульцам страціць форму зімой. «Міністр сказаў, што задача гульнявых відаў спорту — быць у спісе 25 лепшых зборных каманд Еўропы і свету. Мы яе ўжо выканалі. На сёння жаночая зборная Беларусі па індорхакеі займае трэцюю пазіцыю ў сусветным рэйтынгу. Каб разумець усю значнасць гэтага месца, варта адзначыць, што індорхакей у свеце развіваюць 137 краін. Для параўнання, усім вядомы хакей з шайбай — 72 краіны. У хакеі на траве жаночая зборная зараз на 21-м месцы сусветнага рэйтынга, некалі былі нават 18-я. У Алімпійскіх гульнях удзельнічаюць 12 найлепшых камандаў свету, але ў нас ёсць шанцы і магчымасці туды трапіць. На Алімпіяду ў Токіа мы ўжо не пападаем, таму нацэльваемся на 2024 год на Парыж».

Для дасягнення гэтай мэты ёсць канкрэтны план, дзеліцца Аляксандр Якіменка: «Да Алімпіяды трэба ісці паступова, крок за крокам. Спачатку трэба змагацца за 1—5 месцы чэмпіянату свету, потым спаборнічаць за медалі. Каманда, якая з гэтым справіцца, будзе канкурэнтаздольнай і зможа прэтэндаваць на алімпійскія ліцэнзіі. Мы першы крок ужо зрабілі — выйгралі чэмпіянат Еўропы па індорхакеі. У хакеі на траве жаночая зборная ўваходзіць у топ-8 камандаў Еўропы».

У сучаснага індорхакея ў Беларусі жаночае аблічча. І гэта лёгка растлумачыць: у краіне чатыры клубы з жаночымі камандамі — баранавіцкі «Тэкстыльшчык-БарДУ», гродзенскі «Рытм», смалявіцкая «Вікторыя», «Мінск». А мужчынскіх камандаў — толькі дзве: «Мінск» і брэсцкі «Будаўнік». Але мужчыны бяруць не колькасцю, а якасцю. Нацыянальная мужчынская зборная па індорхакеі ўпершыню ў гісторыю выйшла ў фінал чэмпіянату Еўропы, які пройдзе ў 2022 годзе. У хакеі на траве мужчынская каманда да 21 года выступае ў другім дывізіёне чэмпіянату Еўропы. Мужчынская каманда «Мінск» у 2020 годзе заняла трэцяе месца ў Кубку еўрапейскіх чэмпіёнаў.

Не адстае і маладое пакаленне. Па ўсёй Беларусі гэтым відам спорту займаецца каля 2000 чалавек. Маладзёжныя каманды да 21 года, і мужчынская, і жаночая, будуць выступаць у фіналах чэмпіянату Еўропы. У лютым 2021 года ў Мінску прайшоў «Адкрыты Кубак сталіцы» памяці заслужанага трэнера Рэспублікі Беларусь Уладзіміра Жмакіна сярод юнакоў і дзяўчат 2005—2006 гадоў нараджэння.

### «Жыллёвае» пытанне

Аднак і ў гэтай шчаслівай сям'і існуюць свае праблемы. Нягледзячы на тое што ў кожным рэгіёне ёсць свая школа па хакеі на траве, адчуваецца недахоп інфраструктуры. «Зразумела, што вынікі на спаборніцтвах непасрэдна залежаць ад умоў трэніровачнага працэсу, з чым у нас праблемы. Тытулаваны гродзенскі «Рытм» даўно заслужыў добрае пакрыццё і спецыяльны зал для заняткаў індорхакеем. Пастанова Міністэрства спорту і турызму ўключыла хакей на траве ў спіс 20 прыярытэтных відаў спорту на 2021 год. І хацелася б, каб гэты прыярытэт праяўляўся ў адносінах да клубаў, дзіцячых школ, каб у спартсменаў былі належныя ўмовы для развіцця. Зразумела, без належнага фінансавання гэта цяжка. Аднак жа неабходна для стварэння моцных зборных, гонару краіны», — падкрэсліў Аляксандр Якіменка.

У адрозненне ад рэгіёнаў, у сталіцы гэтая праблема ўжо вырашаецца. Плануецца, што сёлета ў Мінску з'явіцца новае поле для хакея на траве, будзе абноўлена пакрыццё поля ў парку Горкага. Па словах старшыні федэрацыі, гэтыя меры неабходныя на доўгі час: «Абнаўленне палёў патрэбна ж не толькі камандам, гэта вялікі ўнёсак у развіццё ўсяго спорту. Мы зможам праводзіць міжнародныя спаборніцтвы, да нас хочуць прыязджаць».

Добры ў гэтым плане прыклад Баранавіч — у 2013 годзе там была пабудавана выдатная арэна «Дубава-спорт». Кожны год там праводзіцца міжнародны турнір — кубак Садружнасці, які негалосна прызвалі кубкам СНД. У 2019 годзе там правяла збор зборная каманда Індыі.

У «сям'і» павінен быць свой дом, таму ў кароткатэрміновай перспектыве — будаўніцтва дома для індорхакея і хакея на траве. «Толькі ў Мінску займаецца 270 дзяцей, але праз адсутнасць залы, зімой цяжка з імі працаваць належным чынам. Я думаю, мы заслужылі свой уласны дом — у першую чаргу ён патрэбен для індорхакея. У нас ёсць каманды, якія ўжо паказваюць вынікі, перспектыўныя дзеці, якія будуць яго паказваць. Гэтае пытанне актыўна распрацоўваецца. Спадзяюся, хутка пачнецца будаўніцтва аб'екта, які стане важнай вехай у развіцці нашага спорту», — падзяліўся Аляксандр Якіменка.

### І ў горы, і ў радасці

Нягледзячы на пераносы і адмены спаборніцтваў праз пандэмію каранавіруса, беларускія хакеісты ідуць да сваіх мэт. Планавалася, што ў лютым пройдзе Кубак свету па індорхакеі, але яго перанеслі на 2022 год. Дарэчы, летась мужчынская каманда «Мінск» заняла на гэтым турніры трэцяе месца, мэтай на гэты год было пераўзысці свой вынік, але давядзецца пачакаць. Гульнявую практыку набывае і маладое пакаленне хакеістаў. З пачаткам вясны з зімовых канікул вернецца хакей на траве. Першы міжнародны турнір у новым сезоне — Кубак Садружнасці сярод жаночых камандаў, які традыцыйна прымаюць Баранавічы. Мужчыны рыхтуюцца да Еўраліг і.

У лютым прайшоў чэмпіянат Беларусі па індорхакеі. Пераможцамі сталі каманды «Мінск-1» як у жанчын, так і ў мужчын. «Гэты чэмпіянат краіны раскрыў новых зорачак, якія ў будучым сябе добра праявяць. Гэта яшчэ раз даказвае, што мы робім усё правільна, і ў Беларусі ёсць таленавітыя хакеісты», — падвёў вынікі першынства краіны Аляксандр Якіменка.

Асноўныя характарыстыкі сям'і беларускага хакея на траве — амбіцыйнасць і смеласць. Глава гэтай сям'і ўпэўнены: без такіх якасцяў у сучасным спорце не абысціся: «Паўтаруся, наша галоўная мэта — Алімпійскія гульні, і дзеля гэтага ўсе гатовы і будуць рабіць усё магчымае. Нашы каманды павінны змагацца з моцнымі камандамі свету, імкнуцца да вядучых пазіцый. Мужчынам, можа быць, цяжэй гэта рабіць, чым дзяўчатам, бо мужчынскі хакей развівае больш краін. Але гэта акалічнасць не павінна быць перашкодай да развіцця і выхаду на высокі ўзровень. У нашага спорту вялікія перспектывы, будучае за хакеем на траве».

**Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.**

# Разам супраць

**Алімпізм — з'ява больш шырокая, чым спартыўныя спаборніцтвы. Мала што так глабальна ўплывае на свет і чалавецтва ў самых розных сферах. Міжнародны Алімпійскі камітэт прыкладае шмат намаганняў для забеспячэння гендарнай роўнасці, інклюзіўнасці, салідарнасці і недыскрымінацыі.**

У лютым выканаўчы камітэт МАК прапанаваў новую стратэгічную дарожную карту развіцця — «Алімпійская павестка 2020+5», якая будзе рэгуляваць работу МАК і алімпійскага руху да 2025 года. Дакумент уключае 15 рэкамендацый і заснаваны на ключавых тэндэнцыях, якія будуць мець вырашальнае значэнне ў постканавірусным свеце. У цэнтры ўвагі рост лічбавізацыі, цесная салідарнасць паміж рознымі супольнасцямі, павышэнне даверу да спартыўных устаноў, павышэнне эканамічнай устойлівасці спартыўных арганізацый. Якія ж праблемы чалавецтва алімпізм актыўна вырашае сёння?

**Ахова здароўя.** Міжнародны алімпійскі камітэт, Міжнародны паралімпійскі камітэт і арганізацыйны камітэт Алімпійскіх гульняў у Токіа прадставілі першую версію правілаў паводзін спартсменаў на галоўных стартах. Важнае нованаўвядзенне — мабільная праграма, якую спартсмены будуць абавязаны выкарыстоўваць для справаздач аб стане свайго здароўя. Там жа будзе прадстаўлена ўся неабходная інфармацыя аб эпідэмічнай абстаноўцы на алімпійскіх аб'ектах. Асобую ўвагу арганізатары надаюць паводзінам жыхароў вёскі спартсменаў. Атлеты мусяць максімальна пазбягаць фізічнага кантакту з людзьмі, якія не адносяцца да іх камандаў, і захоўваць дыстанцыю у два метры. Спартсменам будзе забаронена наведваць спаборніцтвы ў якасці гледачоў.

Арганізатары распрацавалі строгія правілы тэсціравання на каранавірус. За 72 гадзіны да паездкі ў Токіа ўсе ўдзельнікі павінны здаць тэст на каранавірус. Падчас Алімпіяды ўдзельнікі Гульняў будуць здаваць тэсты на каранавірус кожныя чатыры дні. Спартсменам неабавязкова рабіць прышчэпку ад каранавіруса. Правілы будуць прымяняцца да ўсіх удзельнікаў, незалежна ад таго, вакцынаваны яны ці не.

У маі 2020 года Сусветная арганізацыя аховы здароўя і Міжнародны алімпійскі камітэт падпісалі пагадненне аб супрацоўніцтве ў інтарэсах умацавання здароўя праз спорт і фізічную актыўнасць. А ўвосень МАК заснаваў міжнародны сертыфікат супрацоўніка па ахове здароўя ў спорце і запусціў адпаведны навучальны курс.

**Гендарная роўнасць.** Міжнародны алімпійскі камітэт імкнецца да гендарнай роўнасці, што паўплывала нават на кадравыя змены ў арганізацыйным камітэце Алімпійскіх гульняў у Токіа. Былы кіраўнік аргкамітэта Ёшыра Моры абвінавацію жанчын у доўгіх размовах і выступленнях падчас нарад.

На лядовых віражах

Ігнат ГАЛАВАЦЮК:

# «Я не імкнуся быць прыкладам для іншых»

**Ідэя аднойчы прачнуцца паспяховым і знакамітым чалавекам, канешне, прывабная, але відавочна нецікавая. Куды больш захапляльна кожны дзень пераадольваць сябе, ведаць кошт кожнай секунды і, як кажуць канькабежцы, хадзіць па лязе. Гучыць як сюжэт трылера, але гэта звычайнае жыццё Ігната Галавацюка. Ён — чэмпіён свету сярод юніёраў, чэмпіён свету сярод студэнтаў, неаднаразовы прызёр этапаў Кубка свету па канькабежным спорце і галоўная надзея на Алімпійскіх гульнях 2022 года. На чэмпіянаце свету, які прайшоў у лютым, ён паказаў высокі вынік — заняў восьмае месца. А дагэтуль былі паспяховыя выступленні на этапах Кубка свету і перамогі на першынствах Беларусі. Ігнат расказаў «Звяздзе», як яму ўдаецца растапіць лёд і сэрцы аматараў канькабежнага спорту.**

***— Ігнат, раскажы, калі ласка, як праходзіць чарговы сезон?***

— Сёлета ў нас атрымаўся вельмі кароткі сезон, які ўжо скончыўся. Некаторыя этапы Кубка свету былі адменены, чэмпіянат свету павінен быў прайсці ў Кітаі, але праходзіў у Нідэрландах, былі адменены і некаторыя зборы. Таму мы працавалі дома, а потым паехалі ў Нідэрланды, дзе для спартсменаў былі створаны bubble-ўмовы, або ўмовы «пузыра». І так мы правялі два этапы Кубка свету і чэмпіянат свету. Зараз крыху адпачну і з красавіка будзем зноў працаваць.

***— Што такое bubble-канцэпцыя, як табе выступленне ў такіх умовах?***

— Мне спадабалася, менш энергіі трацілася на зборы і пералёты паміж рознымі краінамі. Было зручна адзін раз прыляцець, паўтара месяца там правесці, выступіць на ўсіх стартах і паехаць дадому. Арганізатары малайцы, усё зрабілі якасна і зручна. Дзякуючы гэтай канцэпцыі «пузыра» спартсмены з усяго свету змаглі паспаборнічаць і паказаць вынікі. Самае галоўнае — змаглі выступіць на чэмпіянаце свету.

***— У гэтым сезоне ў вас было мала турніраў — два этапы Кубка свету, чэмпіянаты Еўропы і свету. Як такі каляндар паўплываў на падрыхтоўку і выступленні?***

— Стартаў, канешне, было мала, але мне хапіла. Не скажу, што я вельмі засмуціўся, што выступленняў менш чым звычайна. У нас была мяккая падрыхтоўка, мы дакладна ведалі, да якіх дат трэба выйсці на пік формы. І кожны ў нашай камандзе да галоўнага старту падышоў добра падрыхтаваны, мы ўсе дастойна выступілі. У Беларусі для падрыхтоўкі былі больш камфортныя ўмовы, чым у Еўропе, там многія каткі закрытыя.

***— Якую адзнаку дасі гэтаму незвычайнаму сезону?***

— Пастаўлю яму моцную васьмёрку па дзесяцібальнай шкале. Ёсць моманты, якія не атрымаліся. Некаторыя нават пераўзышлі ўсе чаканні. Дзясятку не магу паставіць, гэта адзнака вартая турніраў, дзе ёсць медалі. А так я на кожным старце быў у топ-10, таму сезонам я задаволены.

***— Якім стартам задаволены больш за ўсё?***

— Цяжка вылучыць адзін турнір, на кожным было штосьці выдатнае. Я задаволены, што наблізіўся да сваіх рэкордаў на высакагор'і, да нацыянальных рэкордаў на раўнінных катках. Увогуле стаў паказваць добрыя секунды. На другім этапе Кубка свету на дыстанцыі 500 метраў мне не хапіла адной сотай секунды да трэцяга месца. Добра выступіў на чэмпіянаце свету — два восьмыя месцы на 500 і 1000 метрах, гэта пакуль найлепшае выступленне ў маёй кар'еры. І я задаволены і ўдзячны, што ў такіх складаных умовах нам удалося добра выступіць.

***— Зразумела, што пандэмія паўплывала на падрыхтоўку спартсменаў ва ўсім свеце. Былі такія канькабежцы, якія цябе здзівілі на спаборніцтвах?***

— На мой погляд, сёлета ўсе беглі горш, чым звычайна. Зразумела, што пандэмія зрабіла свой узнёсак у гэта. Не магу сказаць, што мяне нехта моцна здзівіў. Сярод лідараў новых твараў не з'явілася. Магу толькі адзначыць спартсмена з Нарвегіі Бьёра Магнусена, ён летась добра бегаў і зараз добра сябе паказаў. А астатнія — усе тыя ж добрыя знаёмыя твары.

***— Твой трэнер Сяргей Мінін у адным з інтэрв'ю назваў цябе «ўніверсальным спартсменам, які можа бегчы спрынт, удзельнічаць у мнагабор'і, дапамагаць у камандный гонцы і мас-старце». Ты адчуваеш сябе такім?***

— Я пагаджуся, што я ўніверсальны спартсмен. Але з кожным годам усё больш разумею, што трэба быць сканцэнтраваным на чымсьці адным і там паказваць добрыя вынікі, чым распыляцца на ўсё і быць пасярэдзіне. У канькабежцаў хтосьці лепей бяжыць спрынт, хтосьці — доўгія дыстанцыі, якія мне даюцца цяжэй. Таму зараз я засяроджаны на сваіх дыстанцыях — 500 і 1000 метраў. Універсальныя спартсмены — гэта мнагаборцы, я да іх не адношуся. Таму мне трэба адыходзіць ад сваёй "універсальнасці" і быць сканцэнтраваным на сваіх дыстанцыях.

***— Якія тэндэнцыі зараз назіраюцца ў сусветным канькабежным спорце?***

— Па топавых спартсменах відаць, што лепш за ўсё канькабежцы бягуць у 27—29 гадоў. Галоўная тэндэнцыя застаецца нязменнай: перамагае той, хто ўпарта працуе.



Агульных тэндэнцый у спорце няма, у спартсменаў з кожнай краіны ёсць свае адметнасці.

***— Чым вылучаецца канькабежны спорт Беларусі?***

— Цяжка сказаць. У нас заўсёды была маладая каманда, калі гэта можна лічыць адметнасцю. А так не магу сказаць, што мы чымсьці вылучаемся, бо ў нас мала спартсменаў. Асабіста мне хацелася б, каб у краіне было больш канькабежцаў, тады б у нас была канкурэнцыя і спартсмены лепш развіваліся б.

***— Ігнат, тваё супрацоўніцтва са зборнай Расіі пад кіраўніцтвам Канстанціна Палтаўца працягваецца?***

— Ужо не, гэта быў цікавы і карысны перыяд, але ён скончыўся. Мы правялі выдатны год. Косця зараз трэніруе галандскую каманду, а я працую са сваімі трэнерамі Сяргеем Мініным і Віталем Рогаўцавым. З Косцем мы зараз падтрымліваем сяброўскія адносіны, але не рабочыя.

**«На другім этапе Кубка свету на дыстанцыі 500 метраў мне не хапіла адной сотай секунды да трэцяга месца».**

***— Ты расказваў, што вядзеш дзённік, куды запісваеш кожную сваю трэніроўку. Навошта ты гэта робіш?***

— Так, пачынаючы з 2014 года я запісваю кожную трэніроўку. Гэта ўжо абавязковая частка майго трэніровачнага працэсу. Такія запісы дапамагаюць аналізаваць сябе і сваю працу. Я гляджу, параўноўваю, якія аб'ёмы выконваў раней, да якіх вынікаў гэта прывяло. Упэўнены, мае дзённікі дапамогуць у маёй будучай трэнерскай рабоце. Па сутнасці, гэта гатовы план спартсмена, які хутка бяжыць і паказвае добрыя вынікі. Яго можна скапіраваць і па ім трэніраваць маладых спартсменаў.

***— Падчас сваёй спартыўнай кар'еры ты прайшоў праз «рукі» трох трэнераў. Чаму кожны з настаўнікаў цябе навучыў?***

— Ларыса Казакевіч, мой першы трэнер, прывіла мне любоў да канькабежнага спорту. Сяргей Мінін, галоўны трэнер нацыянальнай зборнай, навучыў адказнасці, пэўнай свядомасці. Канстанцін Палтавец развіў мой прафесіяналізм, Мне заўсёды шанцавала з трэнерамі.

***— Улічваючы, што ў цябе ёсць дыплом трэнера, плануеш працаваць па спецыяльнасці?***

— Пакуль не думаў аб гэтым. У найбліжэйшыя пару гадоў дакладна не, яшчэ хачу пабегаць. А потым, калі будзе добрая зарплата і належныя ўмовы, чаму б і не?

***— А тваё захапленне здымкамі відэа на YouTube атрымае працяг?***

— Зрэдку магу штосьці для «Інстаграма» зняць, а так хобі пагасла. І не таму, што мне надакучыла, а таму што не хапае часу. Ёсць пэўныя сямейныя пытанні, вартыя ўвагі, з'яўляюцца больш важныя справы. А яшчэ я зараз зноў вучуся ва ўніверсітэце, таму не да відэа пакуль.

***— Раскажы падрабязней пра свой другі ўніверсітэт?***

— Летась я паступіў у Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, вучуся па спецыяльнасці «юрыдычнае права». Зразумеў, што ў будучым для прасоўвання па кар'ернай лесвіцы дыплома БДУФК можа быць недастаткова. На маю думку, юрыдычныя веды ніколі не будуць лішнія, пасля спорту трэба ж будаваць жыццё. Нават, працуючы трэнерам, трэба ўзаемадзейнічаць з рознымі дзяржаўнымі ўстановамі, вырашаць юрыдычныя пытанні. Трэнер — гэта больш, чым проста дзве трэніроўкі на дзень. Вучыць юрыспрудэнцыю часам цяжка, але ў цэлым цікава.

***— Ігнат, цябе часта ставяць у прыклад маладым спартсменам, журналісты цябе ўспрымаюць як «твар беларускага канькабежнага спорту». Як ты да гэтага ставішся?***

— Я ніколі пра гэта не задумваўся і тым больш не ставіў сабе мэту быць прыкладам ці «тварам спорту». Я проста раблю тое, што я люблю, і стараюся рабіць гэта добра. Калі людзі так пра мяне кажуць — значыць, ім лепш бачна.

***— Да зімовых Алімпійскіх гульняў у Пекіне застаўся год, як у цябе справы з ліцэнзіяй?***

— У новым сезоне будзе адбор, таму пакуль рана аб гэтым казаць. Прызнацца шчыра, я не думаю аб тым, каб патрапіць на Алімпіяду, я думаю аб выніках, якія там пакажу. Адабрацца, спадзяюся, будзе лёгка, а вось паказаць добры вынік — задача цяжкая.

***— Ігнат, адкрый сакрэт сваёй матывацыі.***

— Ніякага сакрэту няма. Мая матывацыя — жаданне самасцвердзіцца і добра праяўляць сябе ў сваёй справе.

**Фота з асабістага архіва героя.**

# хвароб і за спорт

Як алімпізм аб'ядноўвае чалавецтва

МАК адзначыў, што такія выказванні абсалютна недарэчныя і супярэчаць прынцыпам МАК і рэформам яго Алімпійскай павесткі — 2020. Ёшыры Моры папрасіў прабачэння за свае словы і за 160 дзён да пачатку Гульняў у Токіа сышоў у адстаўку. «Я прынёс вялікія нязручнасці сваімі непрыстойнымі выказваннямі. Я не павінен быць перашкодай для падрыхтоўкі да Алімпіяды», — адзначыў ён. Пасаду кіраўніка аргакамітэта Токіа-2021 заняла Сэйка Хашымота, бронзавы прызёр Алімпійскіх гульняў у канькабежным спорце.

